ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 ЛЮТАГА 2018 г. ЧАЦВЕР № 22 (28638)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

«Ведала — буду артысткай»

«Універсітэт 3.0»: да новай мадэлі

Вартавы прыроды

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ЛІС, старшыня Брэсцкага аблвыканкама:

«Для нас прадстаўлена выдатная магчымасць — Указ № 462 аб дзесяцідзённым бязвізавым рэжыме ў чатырох раёнах Брэсцкай вобласці і Брэсце. Многія, падобна, чакаюць яшчэ чагосьці. Давайце вырашым, што ўсе старшыні гар-, райвыканкамаў, на якіх гэты рэжым распаўсюджваецца, персанальна адказныя за работу па прыёме турыстаў. Гэта новыя працоўныя месцы, падаткі ў мясцовыя бюджэты. Само яно не прыйдзе, для гэтага трэба вельмі сур'ёзна працаваць з тураператарамі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.02.2018 г.

Долар ЗША	1,9803 ▼
Еўра	2,4618 ▲
Рас. руб.	0,0352 ■
Укр. грыўня	0,0711 ▲

ISSN 1990 - 763X

Музычны прыпынак

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Па-чалавечы

РАТУЮЧЫ ПРЫРОДУ, ДАПАМАГАЕМ ДУШЫ

Як беражлівыя адносіны да навакольнага асяроддзя звязаны з нашым унутраным светам?

Чаму б не закіпяціць поўны чайнік вады, калі трэба заварыць усяго толькі кубак гарбаты? Навошта ездзіць на веласіпедзе, калі на машыне зручней? У нашым жыцці існуе велізарная колькасць звычак, на якія мы з часам перастаём звяртаць увагу. Але яны становяцца не толькі другой натурай: ад звычак залежыць свет, у якім мы жывём. Як мінімум — экалагічная сітуацыя ў краіне, рэгіёне і, па вялікім рахунку, свеце. Пра тое, чаму важна беражліва ставіцца да навакольнага асяроддзя і як гэтаму навучыцца, распавядае інтэрактыўная выстаўка «Чалавек і тварэнне». СТАР. 13

З гэтага стэнда ўсё пачынаецца.

■ Занятасць

ДОБРЫ ЧАС ДЛЯ САІСКАЛЬНІКАЎ

Чаго чакаць ад рынку працы сёлета

Ці стане прасцей знайсці работу? Што будзе з зарплатамі? Каму варта задумацца аб змене прафесіі? Мы папрасілі экспертаў падзяліцца прагнозамі на бягучы год.

Рынак — у стане раўнавагі

На пачатак года ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя склаў 0,5 працэнта.

— Мяркуем, што рынак прыйшоў у стан раўнавагі. Сёлета мы не чакаем скачкоў у росце колькасці беспрацоўных, — дзеліцца бачаннем сітуацыі **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.** — Колькасць вакансій, па нашых ацэнках, будзе трымацца ў межах 50—60 тысяч, таму напружанасць на біржы наўрад ці вырасце. Цяпер на адну вакансію прыпадае 0,4 беспрацоўнага.

Згодна з інфармацыяй Белстата, летась рэальная заработная плата па краіне была на шэсць працэнтаў большая, чым у 2016-м. Самы прыкметны рост заробкаў назіраўся ў такіх відах дзейнасці, як лесаводства і лесанарыхтоўкі (плюс 16 %), металургічная вытворчасць (плюс 13,5 %), вытворчасць аўтамабіляў і прычэпаў (плюс 13 %), транспартных сродкаў і абсталявання (плюс 12 %). Ці захаваецца гэта тэндэнцыя сёлета? СТАР. 4

■ Парламенцкі дзённік

РАСКЛАД НА ЗАЎТРА

Савет Палаты прадстаўнікоў разгледзеў графік падрыхтоўкі пытанняў на сесію

Акрамя таго, на Савеце абмеркавалі план міжнароднага парламенцкага супрацоўніцтва на гэты год. Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА расказаў, што чакае сёлета дэпутатаў:

«Ужо сёння ў нас на разглядзе знаходзіцца 40 законапраектаў, 29 з якіх уключаны ў графік. Тэрміны, устаноўленыя ў ім, павінны няўхільна выконвацца. А тыя праекты, над якімі камісіі яшчэ працуюць, трэба аператыўна дапрацаваць і ўключыць у графік разгляду на гэту сесію. Трэба сур'ёзна павысіць адказнасць дэпутатаў за падрыхтоўку праектаў, а старшыням камісіі больш жорстка кантраляваць гэты працэс».

Акрамя таго, дэпутатаў чакае работа з кодэксамі. А таксама падрыхтоўка законапраектаў па пытаннях, напрыклад, донарства крыві і яе кампанентаў. У працэсе яшчэ шэраг дэпутацкіх ініцыятыў, якія датычацца асабліва ахоўных прыродных тэрыторый, карэкціроўкі Лясного кодэкса.

За гэты год плануецца правесці парламенцкія слуханні па трох тэмах: энергетыка, інвестыцыі і адукацыя. Старшыня Палаты прадстаўнікоў лічыць, што яны павінны мець практычны вынік у выглядзе рэкамендацый, якія могуць быць улічаны пры падрыхтоўцы законаў. Такі ж падыход павінен прысутнічаць на семінарах, круглых сталах і выязных пасяджэннях — усяго запланавана каля паўсотні мерапрыемстваў.

Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Беларусі ПІРШТУК паведаміў, што 11 законапраектаў будуць разгледжаны ў першым чытанні, 17 — паўторна, а яшчэ ў Палату прадстаўнікоў паступіў Дэкрэт № 8. «Я б адзначыў некалькі кірункаў: першае — гэта блок законапраектаў, які звязаны з паляпшэннем эканамічнага становішча ў краіне. Можна было б узгадаць дзяржаўна-прыватнае партнёрства, Банкаўскі кодэкс. Дэкрэт № 8 варты дадатковай увагі, таму што гэта абсалютна новы кірунак, ён практычна закладвае асновы для стварэння новага кодэкса ў развіцці эканамічнага складніка краіны. Будзе цэлы шэраг законапраектаў, якія ў прынцыпе паляпшаюць спажывецкія ўласцівасці. Яны скіраваны на аказанне разнастайных паслуг. Тут можна было б назваць такія, напрыклад, як пітное водазабеспячэнне, — тэма дастаткова актуальная для краіны, якасць харчовых і наогул тавараў, абарона правоў спажыўцоў».

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Валерый ВАРАНЕЦКІ расказаў, што летась аўтарытэт парламента значна ўмацаваўся на міжнароднай арэне. Сёлета работа працягнецца, напрыклад, плануецца супрацоўнічаць з Парламенцкай асамблеяй АБСЕ, пачаць актыўна ўзаемадзейнічаць з ПА Савета Еўропы, а таксама з ПА Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва, Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора. Нягледзячы на тое, што ў прыярытэце застаецца работа ў рамках структур, створаных на прасторы СНД, пашыраюцца сувязі і з МПА АСЕАН, і з Лацінаамерыканскім парламентам.

Надзея АНІСОВІЧ

■

■ Погляд

ЦЭЛЮЛОЗА ПЛЮС ІТ-ТЭХНАЛОГІІ

Эканамічныя перспектывы 2018 года

Мінулы год прадэманстраваў значнае паляпшэнне і ўмацаваў сувязі Беларусі з сусветнай эканомікай. Ёсць надзеі на тое, што пазітыўнае развіццё не толькі працягнецца, але і зможа набраць больш хуткія тэмпы. Вынікі 2017 года — рост беларускай эканомікі на 2,4 працэнта. Што можа дазволіць нам выйсці на больш высокі паказчык?

Перш за ўсё, год пачаўся з найлепшай цаны на нафту за апошнія тры гады. Калі 2016 год стартаваў з крытычна нізкай цаны менш за 30 долараў, то на пачатку 2017 года мы ўбачылі цану ў паўтара раза вышэйшую, а пачатак 2018 года парадаваў павелічэннем цаны ў два з лішнім разы. Для Беларусі гэта крытычна важна, паколькі наша спецыялізацыя — перапрацоўка сырой нафты ў чатырыста відаў таварнай прадукцыі — уносіць вельмі вялікую долю ў беларускі экспарт у цэлым. Нізкія цэны на нафту азначаюць нізкія цэны і на зробленую з яе прадукцыю, што рэзка адкідвае ўніз паказчыкі беларускага экспарту. Пры захаванні цэн на нафту на працягу года ў дыяпазоне 60—70 долараў беларуская эканоміка будзе здольная сур'ёзна прыбавіць. Высокія цэны на нафту таксама азначаюць вялікія стымулы для ўкаранення новых тэхналогій у сектары беларускай нафтаперапрацоўкі і вялікія фінансавыя магчымасці гэта зрабіць. Галоўным з падобных праектаў, вядома, для Беларусі з'яўляецца далейшае пераўзбраенне двух нашых нафтаперапрацоўчых заводаў з тым, каб у 2018—2019 гадах выйсці на ўзровень Германіі па выпрацоўцы светлых прадуктаў з сырой нафты.

У 2018 годзе выходзіць на сур'ёзны ўзровень прамысловая вытворчасць у сферы легкавога транспарту. Сумесны праект Беларусі і адной з найбуйнейшых карпарацый Кітая і свету Geely дазволіць вырабляць не тысячы легкавых машын, як гэта было летась, а дзясяткі тысяч. Пры гэтым асноўная доля павінна пайсці на экспарт, што азначае не толькі прырост эканомікі, але і прыцягненне замежнай валюты, што важна для стабільнасці валютнай сістэмы. А запланаванае ўзрастанне ўзроўню лакалізацыі створыць тысячы новых працоўных месцаў у Беларусі на сумежных прадпрыемствах.

Завод па вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы, пабудаваны на базе ААТ «Светлагорскі ЦКК», таксама выйдзе на поўнамаштабную вытворчасць. Доўгія гады ўкладанняў (па беларуска-кітайскім інвестыцыйным праекце асвоена больш за 850 млн долараў) нарэшце пачнуць прыносіць вынік у выглядзе вялікіх аб'ёмаў гатовай таварнай прадукцыі, запатрабаванай на знешніх рынках. Як вядома, магутнасць вытворчасці складзе прыкладна 400 тыс. тон сульфатнай беленай цэлюлозы, з якіх больш за палову плануецца экспартаваць. Праект не толькі акажа пазітыўны ўплыў на тэмпы росту экспарту, але і дазволіць адмовіцца ад імпарту аналагічнай прадукцыі, таксама ўзрасце ўзровень асваення беларускай драўніны, што карысна для сектара лясной гаспадаркі. Лес пакрывае 40 працэнтаў тэрыторыі Беларусі, і яго выкарыстанне яшчэ не цалкам вычэрпвае ўсе камерцыйныя магчымасці.

Такая ж сітуацыя складваецца і з праектам «Вялікі камень». Доўгія гады планавання, выдзялення зямель пад будаўніцтва, пракладвання першасных камунікацый засталіся ззаду. У 2018 годзе сумесны з Кітаем праект выходзіць ужо на ўзровень, калі пачне даваць аддачу. 2017 год завершаны з 23 рэзідэнтамі, за першыя тры тыдні студзеня іх колькасць узрасла яшчэ на тры. Будзем спадзявацца (калі зыходзіць з усё большай інфармаванасці замежнага бізнесу аб магчымасцях па інвесціраванні ў «Вялікі камень»), што іх колькасць за 2018 год павялічыцца яшчэ на 10—15 як мінімум. Такім чынам, як ужо прынятыя, так і наступныя рэзідэнты стануць будаваць адміністрацыйныя і вытворчыя памяшканні, а таксама вырабляць гатовую прадукцыю і аказваць паслугі, што пазітыўна адаб'ецца на тэмпах беларускай эканомікі.

Адным з самых магутных стымулаў для развіцця беларускай эканомікі можа стаць сектар інфармацыйных тэхналогій. Як сам па сабе, так і тая ўвага, якая ўжо прыцягнута да Беларусі з-за хуткага ўступлення ў дзеянне (28 сакавіка) Дэкрэта № 8 «Аб развіцці лічбавай эканомікі». У выніку яго прыняцця Беларусь становіцца першапраходцам у сферы дзяржаўнага рэгулявання крыптавалют і блокчэйна, і ліберальны характар гэтага рэгулявання выклікае цікавасць да Беларусі па ўсім свеце, якая адаб'ецца станоўча і на іншых сектарах эканомікі.

Пазітывам для Беларусі з'яўляецца і рост цэн на прадукцыю машынабудавання, які пачаўся летась, пры ўмове, што сёлета ён не паверне назад.

У той жа час ёсць і рызыкі, якія таксама вялікія. Сусветная эканоміка ўсё яшчэ нестабільная, а новая халодная вайна Расіі і Захаду будзе па-ранейшаму негатыўна адбівацца на тэмпах развіцця як самой Расіі, так і яе саюзнікаў. Не дадае аптымізму і тое, што нарастае ўзровень канфліктных адносін ЗША з шэрагам краін, а гэта можа негатыўна адбіцца на сусветнай эканоміцы.

Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук

■

■ Блізкая ўлада

АРЫЕНТАЦЫЯ НА САЦЫЯЛЬНЫ ПАДЫХОД

Праблемы эксплуатацыі дамоў, добраўпарадкавання вуліц, будаўніцтва дарог, паляпшэння інфраструктуры горада — з такімі пытаннямі звярталіся жыхары Гродна да намесніка прэм'ер-міністра Анатоля Калініна падчас прыёму грамадзян.

Свае прапановы, у прыватнасці, агучылі кіраўнікі таварыстваў уласнікаў Сяргей Мікалаевіч і Андрэй Іванавіч. У шэрагу пытанняў — адмена фіксаваных тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі, змяненне парадку аказання дадатковых паслуг, утрыманне прыдамавых тэрыторый. На іх думку, варта прывязаць тарыф на асвятленне агульных месцаў і рух ліфта не да колькасці жыхароў, а да плошчы кватэры. У сваю чаргу прэм'ер-міністр задаўся пытаннем: ці абмеркаваны гэтыя ініцыятывы з агульным сходам жыхароў жыллёва-будаўніча-спажывецкага кааператыва і таварыства ўласнікаў.

— У краіне праводзіцца сацыяльная палітыка, якая ўлічвае інтарэсы ўсіх катэгорый грамадзян, — адзначыў Анатоль Калінін. — Мы гэтыя пытанні разглядалі на працягу апошніх чатырох гадоў, працавалі розныя камісіі, былі прыцягнуты ўсе зацікаўленыя структуры, у тым ліку і таварыствы ўласнікаў. У рэшце рэшт прынята такая форма тарыфнай палітыкі, якая задавальняе патрэбы большасці насельніцтва. Затратны механізм кожнай паслугі разлічаны згодна са структурай абслугоўваючых арганізацый. Мы арыентуемся перш за ўсё на асноўныя масы — на дзяржаўныя арганізацыі. Калі б мы арыентаваліся на таварыствы ўласнікаў, тарыфы былі б вышэйшыя. І такі падыход не спадабаўся б насельніцтву.

Віцэ-прэм'ер паведаміў, што на працягу апошніх двух гадоў затраты ў сектары дзяржаўнага абслугоўвання зніжаны амаль на 200 млн рублёў. У краіне 95 % жылога фонду прыватызавана, таварыствы ўласнікаў пераходзяць на абслугоўванне жыллёва-камунальнай гаспадаркі. У Мінску і некаторых абласных цэнтрах іх колькасць дасягае 40 %. Што датычыцца прывязкі аплаты асвятлення месцаў агульнага карыстання да метражу жылля, гэта пытанне разглядаецца, рашэнне будзе прынята на працягу года.

З прапановай пасадзейнічаць развіццю гродзенскага аэрапорта звярнуўся да віцэ-прэм'ера гараджанін Канстанцін Аляксандравіч. Ён лічыць, што варта адкрываць новыя напрамкі, тым больш, што з гэтага года аэрапорт увайшоў у бязвізавую зону, якую замежныя турысты могуць наведваць да 10 дзён. Анатоль Калінін не бачыць перашкод у арганізацыі маршрутаў. Заканадаўства сёння дазваляе прыняць любога перавозчыка, у тым ліку аператара-лаўкостара. Інфраструктура гродзенскага аэрапорта на дастаткова сучасным узроўні, арганізаваны пастаянныя рэйсы ў Калінінград, а летам — у Балгарыю. І гэту дзейнасць трэба пашыраць, заўважыў віцэ-прэм'ер. Ён падкрэсліў, што для бізнесу важным з'яўляецца наяўнасць пасажырапатоку. Можна сказаць, што тэндэнцыя абнадзейвае. Калі ў 2016 годзе тут было 5 тысяч пасажыраў, то летась ужо ў два разы больш. Чакаецца, што сёлета гэта лічба яшчэ ўзрасце. У сезон магчыма арганізацыя рэйсаў у Варшаву і Вільнюс.

— Важна ўдзяляць увагу не толькі транспарту, але і сферы абслугоўвання, — падкрэсліў Анатоль Калінін. — Неабходна прывесці ў парадак архітэктурныя і гістарычныя помнікі, зрабіць так, каб турыст заставаўся ў Гродне на большы тэрмін.

Маргарыта УШКЕВІЧ

■

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

РЭКЛАМА БІТКОЙНАЎ ЗАБАРОНЕНА Ў СЕТЦЫ FACEBOOK

Новыя рэкламныя правілы Facebook забараняюць рэкламу прапаноў інвеставання ў біткойны. Адным з самых адмоўных прыкладаў, калі наведвальнік сацсеткі можа быць уведзены ў зман, — гэта прапанова «выкарыстаць пенсійныя назапашванні для куплі біткойнаў». Раней Deutsche Bank таксама не рэкамендаваў рабіць укłады ў крыптавалюце. На думку экспертаў крэдытнай арганізацыі, праблемы крыптавалюты заключаюцца ў высокай валацільнасці і магчымых рызыках у сувязі з маніпуляцыямі коштам, а таксама стратай і крадзяжом інфармацыі.

У СОЧЫ ПРАЙШОЎ КАНГРЭС СІРЫЙСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ДЫЯЛОГУ

Нягледзячы на разыходжанне па многіх пытаннях, яго ўдзельнікі ў Сочы былі адзіныя ў сваім закліку захаваць тэрытарыяльную цэласнасць краіны і заявілі, што пытанне па форме праўлення павінны вырашаць самі сірыйцы. Як перадае Euronews, складзены спіс кандыдатаў у Канстытуцыйную камісію, якая будзе працаваць у Жэневе. Канчатковае рашэнне па яе складзе павінен прыняць спецпасланнік ААН па Сірыі Стафан дэ Містура.

ТРАМП НАЗВАЎ ГАЛОЎНЫЯ ПАГРОЗЫ

«Па ўсім свеце мы сутыкаемся з рэжымамі-ізгоямі, тэрарыстычнымі групамі і праціўнікамі накшталт Кітая і Расіі, якія пагражаюць нашым інтарэсам, нашай эканоміцы і нашым каштоўнасцям», — паведаміў прэзідэнт ЗША падчас сваёй прамовы перад кангрэсменамі. У сувязі з гэтым ён заклікаў кангрэс «спыніць небяспечнае зразанне абароннага бюджэту і цалкам прафінансаваць узброеныя сілы ЗША», а таксама пачаць мадэрнізацыю і перабудову ядзернага арсенала краіны.

■ На кантролі

Колькасць перадазіровак сярод падлеткаў паменшылася ў пяць разоў

Міністэрства ўнутраных спраў падвяло вынікі мінулага года

У пасяджэнні калегіі ведамства прынялі ўдзел Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Станіслаў Зась, памочнік Прэзідэнта па нацыянальнай бяспецы Віктар Лукашэнка, кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання. Адкрыў мерапрыемства міністр унутраных спраў Ігар Шуневіч.

Па звестках МУС, галоўны паказчык — колькасць зарэгістраваных злачынстваў у параўнанні з 2016 годам знізіўся на 7,1 %, пры гэтым агульная раскрывальнасць крымінальна каральных дзеянняў узрасла. Так, сярэдні ўзровень злачыннасці па краіне склаў 909 на 100 тысяч насельніцтва (годам раней — 979).

Знізілася колькасць забойстваў і замахаў, наўмысных цяжкіх цялесных пашкоджанняў, згвалтаванняў, разбояў, рабаванняў і крадзяжоў, а таксама махлярстваў і крадзяжоў аўтамабіляў. Выключэнне склала хуліганства, у тым ліку здзейсненае ў грамадскіх месцах.

Стабілізавана наркасітуацыя: агульная колькасць злачынстваў знізілася больш чым на 15 %, удзельная вага такіх злачынстваў з удзелам непаўналетніх зменшылася на 40 %. Акрамя таго, захоўваецца ўстойлівая тэндэнцыя зніжэння колькасці перадазіровак наркотыкамі: напрыклад, сярод падлеткаў яна паменшылася ў пяць разоў, а тых, якія ўвогуле скончыліся смяротным зыходам — у два разы. У той жа час праблема алкагалізму сваёй актуальнасці не губляе. Спіртныя напоі па-ранейшаму з'яўляюцца адным з каталізатараў парушэнняў грамадскага парадку і злачынстваў у дачыненні да членаў сям'і і блізкіх сваякоў. Як і раней, тры чвэрці ўсіх «бытавых» злачынстваў здзейсненыя ў нецвярозым стане.

На жаль, колькасць дзяцей, якія загінулі ў выніку дарожна-транспартных здарэнняў, у параўнанні з 2016 годам павялічылася з 18 да 21. Разам з тым тэндэнцыі зніжэння асноўных паказчыкаў аварыйнасці захаваліся: зменшылася агульная колькасць ДТЗ і пацярпелых у іх грамадзян.

Дар'я КАСКО

■

ЗНОЎ ВЫРАС БПМ І МІНІМАЛЬНЫЯ СПАЖЫВЕЦКІЯ БЮДЖЭТЫ

З 1 лютага ў Беларусі вырасце бюджэт пражытковага мінімуму (БПМ) і, адпаведна, паднімуцца мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, некаторыя дзіцячыя дапамогі, прывязаныя да БПМ, а таксама зменяцца мінімальныя спажывецкія бюджэты.

Бюджэт пражытковага мінімуму з сённяшняга дня складае 199,32 рубля. У сувязі з гэтым павялічацца мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, якія прывязаныя да памеру БПМ.

Павелічэнне БПМ адаб'ецца і на аднаразовай дапамозе ў сувязі з нараджэннем першага дзіцяці, якая цяпер будзе раўняцца 1 993,2 рубля, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей памер аднаразовай дапамогі складзе 2 790,48 рубля. Аднаразовая дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, складзе 199,32 рубля.

З чэрвеня мінулага года быў зменены парадак перагляду выплаты дапамог на дзяцей да трох гадоў: зараз яны пералічваюць двойчы ў год — з 1 лютага і з 1 жніўня. У сувязі з гэтым дапамога на першае дзіця з сённяшняга дня складзе 312,03 рубля, на другое і наступных дзяцей — 356,6 рубля. На дзіця-інваліда да трох гадоў — 401,18 рубля ў месяц.

* * *

Таксама з сённяшняга дня ўстаноўлены новыя памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў (МСБ) для розных сацыяльна-дэмаграфічных груп у сярэдніх цэнах снежня 2017 года.

Сярэднедушавы мінімальны спажывецкі бюджэт маладой сям'і з трох чалавек цяпер складае 356,10 рубля, працаздольнага насельніцтва — 420,60 рубля, студэнтаў — 313,91 рубля, дзяцей ва ўзросце да трох гадоў — 266,56 рубля, дзяцей ва ўзросце ад трох да шасці гадоў — 348,44 рубля, дзяцей ва ўзросце ад шасці да 18 гадоў — 358,70 рубля, пенсіянераў — 331,82 рубля.

Мінімальны спажывецкі бюджэт на аднаго члена сям'і з чатырох чалавек у разліку на месяц цяпер складае 328,45 рубля.

Гэтыя памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў будуць дзейнічаць да канца красавіка 2018 года.

Святлана БУСЬКО.

■ Аўто

ШТРАФЫ — ПА-НОВАМУ

Уступілі ў сілу папраўкі ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях

Нагадаем, яны былі адобраны ў снежні мінулага года ў Палаце прадстаўнікоў у другім чытанні, але напярэдадні пасяджэння магчымыя змены выклікалі нямала спрэчак у грамадстве.

Напрыклад, гучала прапанова не пазбаўляць правоў за паўторнае перавышэнне хуткасці на працягу года. Тады старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Андрэй НАВУМОВІЧ расказаў, што пасля дыскусій у парламенце з удзелам шырокага кола экспертаў было вырашана захаваць дзеючую рэдакцыю артыкула 18.13.

Якія змены і дапаўненні ўступілі ў сілу з 31 студзеня 2018 года? Зменамі ў артыкул 18.17 КаАП (здзяйсненне ДТЗ) прадугледжана, што пры афармленні ДТЗ, у якім удзельніку не нанесены цялесныя пашкоджанні, а маюцца толькі механічныя пашкоджанні транспартнага сродку ці пашкоджанні маёмасці, кіроўца прыцягваецца да адказнасці за парушэнне канкрэтнага пункта(-аў) правілаў дарожнага руху, якое стала прычынай здарэння. Важна, што калі ўдзельнікі ДТЗ аформяць «еўрапратакол», то яны не падлягаюць адміністрацыйнай адказнасці.

Акрамя таго, па прапанове Міністэрства ўнутраных спраў з КаАП выключаецца артыкул 18.18, якім прадугледжаны штраф да дзвюх базавых велічынь за кіраванне аўтамабілем без дакументаў, неабходных па правілах дарожнага руху. Пры сучасным тэхнічным забеспячэнні супрацоўнік ДАІ можа аператыўна на месцы высветліць, мае кіроўца права кіравання ці не. Але, несумненна, злоўжываць гэтым не варта. Цяпер вадзіцель можа быць прыцягнуты да адказнасці па частцы 5 артыкула 18.22 (іншыя парушэнні), які прадугледжвае папярэджанне або штраф у памеры да 0,5 базавай велічыні.

Адміністрацыйны арышт на тэрмін да 15 сутак прадугледжаны за паўторнае — на працягу аднаго года — кіраванне транспартным сродкам асобай, якая не мае права кіравання. Гэта парушэнне будзе разглядацца судамі.

Яшчэ адно новаўвядзенне — пры накладанні штрафу талон да вадзіцельскага пасведчання адбіраць не будуць. Каб вярнуць дакумент, у ДАІ ехаць больш не трэба.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Акрамя таго, з пяці дзён да месяца павялічаны тэрмін для аплаты штрафу, які супрацоўнік ДАІ накладае на месцы. Варыянты аплаты — сістэма «Разлік» (АРІП) або мабільны тэрмінал з выкарыстаннем аплатнай карткі. Калі ж своечасова не аплаціць такі штраф, то ён аўтаматычна павялічыцца на дзве базавыя велічыні.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ

■

ЦЫГАРЭТЫ ДАРАЖЭЮЦЬ

З 1 лютага павышаюцца цэны на некаторыя маркі

Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Міністэрства па падатках і зборах.

Такім чынам, цыгарэты Гродзенскай тытунёвай фабрыкі «Нёман» Pall Mall Red, Pall Mall Blue, Pall Mall Silver будуць каштаваць 1,99 рубля, Pall Mall Nanokings Silver — 1,85 рубля, Pall Mall Superslims Azure, Pall Mall Superslims Violet — 1,9 рубля, Luckies Red, Luckies Silver, Luckies Blue — 2,9 рубля, Luckies Click & Roll, Kent HD Navy Blue, Kent HD Blue — 2,95 рубля, Kent HDi Exclusive Grey, Kent HDi Blue, Kent Mode Blue, Kent Mode Silver — 2,6 рубля, Kent Nano Blue, Kent Nano Silver, Kent Nano White, Kent Nanotek Blue, Kent Nanotek Exclusive Grey, Kent Feel — 2,7 рубля, Vogue Bleue, Vogue Lilas, Vogue Menthe — 3,25 рубля, Rothmans Azure, Rothmans Azure+ — 2,2 рубля.

Таксама вырастуць цэны на некаторыя цыгарэты, якія ўвозіць кампанія «Беларусьгандаль». Напрыклад, Dunhill Blue, Dunhill Gold будуць каштаваць 3,4 рубля, Kent HDi Blue, Kent HDi Silver, Kent Mode Blue, Kent Mode Silver — 2,6 рубля, а Rothmans Demi Silver — 1,99 рубля.

Сяргей КУРКАЧ.

ООО «ГИРИЗ»

ГИДРАВЛИКА: гидроцилиндры, насосы, распределители
РВД и комплектующие
Напорные рукава и шланги
Техпластины
Ремонт гидравлических узлов
ДОСТАВКА ПО ВСЕЙ БЕЛАРУСИ
Самые конкурентные цены
В НАЛИЧИИ МНОГО ТЕХНИКИ ПО ЦЕНАМ ВЕСНЫ 2017 ГОДА
Плуги, бороны, прицепы и полуприцепы. Запчасти к ним.
ВОЗМОЖЕН РАСЧЕТ ВСТРЕЧНЫМИ ПОСТАВКАМИ, ДОГОВОРАМИ ПЕРЕВОДА ДОЛГА.
+375 44 765 08 65 г. Заславль, ул. Советская, 122, каб 126
girza.by
УНП 691586696

Торговое коммунальное унитарное предприятие «ТОРГСТРОЙМАТЕРИАЛЫ» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона

Таблица № 1

№ п/п Лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %	№ п/п Лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %
1	Автопогрузчик с инв. № 6	3 108,00	2	Автопогрузчик вилочный б/у г/п 2тн. FG20 (Мицубиси) с инв. № 211	14 028,00

В отношении имущества, указанного в таблице № 1, проводятся третьи повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 12.01.2018 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 30 %. Окончание приема заявлений в 16.00 13.02.2018 г.

Таблица № 2

№ п/п Лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %	№ п/п Лота	Наименование и краткая характеристика предмета торгов	Начальная стоимость с учетом НДС 20 %
1	Утеплитель multi 40мм (1,2х0,58; толщ. 40, 576 шт.)	2 350,08	4	Утеплитель instal 50 мм (1,2х0,58; толщ. 50, 605 шт.)	3 432,53
2	Утеплитель flex 80мм (1,2х0,6; толщ. 80, 493 шт.)	4 122,27	5	Утеплитель top 20 мм (1,2х1,2; толщ. 20, 476 шт.)	2 600,10
3	Утеплитель ultra 60мм (1,25х0,58; толщ. 60, 633 шт.)	4 812,83			

В отношении имущества, указанного в Таблице № 2, проводятся вторые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 12.01.2018 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 20 %. Окончание приема заявлений в 16.00 13.02.2018 г.

Дата и время проведения торгов	**15 февраля 2018 года в 12.00 (регистрация с 11.40 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф.1122
Шаг аукциона	5 % от начальной стоимости предмета торгов
Задаток	10 % от начальной стоимости предмета торгов

Организатор торгов	ООО «Фрондера», тел. +375 29 305-86-50
Заявление на участие в торгах и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122	
Информация о продавце	Торговое коммунальное унитарное предприятие «ТОРГСТРОЙМАТЕРИАЛЫ», г. Минск, ул. Селицкого, д. 39 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122)
Условия для участия в торгах	1. До подачи заявления внести задаток на р/с BY80ALFA30122215570140270000 код банка ALFABY2X УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: Задаток для участия в торгах, назначенных на __.__.2018, по Лоту №__ (Табл. №_). 2. Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 г. № 16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah 3. Лица, желающие принять участие в аукционе, и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях после возмещения победителем затрат по организации и проведению торгов в размере 5 % от начальной стоимости объекта торгов, а также затрат по размещению публикации (согласно выставленному счету) в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 5 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи. 4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона. 5. Расходы, связанные с регистрацией, транспортировкой и ремонтом имущества, возлагаются на Победителя аукциона

■ Клопат

ВАЖНА ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД

Комплексны падыход у вырашэнні пытанняў занятасці насельніцтва павінен забяспечыць Дэкрэт № 1. Старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага аблвыканкама Пётр ШУЦЬКО адзначыў, што намаганні ўсіх галін органаў улады будуць накіраваны на садзейнічанне занятасці:

— Спецыяльна створаныя камісіі, у склад якіх увойдуць дэпутаты розных узроўняў, прадстаўнікі службы занятасці, ЖКГ, УУС, грамадскіх аб'яднанняў, усебакова вывучаць кожную сітуацыю. Прычым вырашацца пытанні занятасці кожнага чалавека будуць з улікам індывідуальнага падыходу, спецыфікі таго ці іншага раёна. Дарэчы, у рэгіёне беспрацоўныя могуць прайсці перанавучанне і павышэнне кваліфікацыі па запатрабаваных на рынку працы спецыяльнасцях, ім аказваецца дапамога ў перасяленні на новае месца жыхарства, даецца магчымасць атрымаць субсідыі для арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці. Летась магчымасцю адкрыць сваю справу скарысталіся 386 беспрацоўных. Плануецца, што і сёлета субсідыі атрымаюць каля 400 чалавек.

Ад 11 да 15 бюджэтаў пражыткавага мінімуму звычайна атрымліваюць прадпрымальнікі-пачаткоўцы праз службы занятасці. Большую суму — звычайна тыя, хто жыве на вёсцы ці ў малых гарадах з устойліва высокім узроўнем беспрацоўя. Як правіла, на гэтыя сродкі набываецца абсталяванне, неабходнае для ажыццяўлення абранага віду дзейнасці. Для беспрацоўных праводзяцца спецыяльныя курсы па асновах прадпрымальніцкай дзейнасці, аказваецца метадычная і прававая дапамога. У тым ліку, кансультацыі па стварэнні бізнес-плана.

Між тым на Гомельшчыне часцей за ўсё сваю справу беспрацоўныя адкрываюць у сферы аказання паслуг. Папулярнасцю карыстаюцца такія віды дзейнасці, як аддзелачныя работы, груза- і пасажыраперавозкі, цырульніцкія паслугі, рамонт і пашыў адзежы. З'явіліся і новыя: бухгалтарскі ўлік, кансультаванне па падаткаабкладанні, вытворчасць мэблі, драўляных будаўнічых канструкцый і сталярных вырабаў, дзённы догляд дзяцей. Фінансавую падтрымку таксама можна атрымаць на стварэнне сялянскай (фермерскай) гаспадаркі, прыватнага ўнітарнага прадпрыемства, арганізацыю рамесніцкай дзейнасці, развіццё аграэкатурызму.

Увогуле ж на рынку працы назіраецца пэўны дысбаланс попыту і прапановы. Высокакваліфікаваныя спецыялісты, такія як медыцынскія работнікі, напрыклад, паўсюль запатрабаваны. Хутка знойдуць працу швачкі, муляры, бетоншчыкі. У сельскай гаспадарцы па-ранейшаму не хапае механізатараў і аператараў машыннага даення, а таксама аграномаў і ветэрынараў. Але ж сярод беспрацоўных самым вялікім попытам карыстаюцца вакансіі, дзе не патрэбны асаблівыя навыкі і кваліфікацыя. Пры гэтым вакансій вартаўнікоў, вахцёраў і прыбіральшчыц няма. Для таго каб насыціць рынак неабходнымі спецыялістамі, праводзіцца перанавучанне і павышэнне кваліфікацыі беспрацоўных. Летась у вобласці прайшлі перанавучанне больш за дзве тысячы чалавек. Сёлета плануецца працаўладкаваць на новыя створаныя працоўныя месцы каля сямі тысяч чалавек.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

Дарэчы

На 1 студзеня ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя ў Гомельскай вобласці склаў 0,7 % да эканамічна актыўнага насельніцтва. Каэфіцыент напружанасці на рынку працы — 0,5. Значыць, на аднаго беспрацоўнага ёсць дзве вакансіі.

ДОБРЫ ЧАС...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота БЕЛТА.

— Мы бачым па банку вакансій, што памер заяўленых наймальнікамі заробкаў большае. У канцы 2017-га была праведзена работа па паляпшэнні аплаты ў бюджэтнай сферы. Прыняты рашэнні па павелічэнні мінімальнага заробку, тарыфнай стаўкі першага разраду. Гэта таксама паўплывае на рост даходаў, — адзначае Алег Токун.

І ўсё ж такі некаторым работнікам варта задумацца аб змене прафесіі. У горадзе найменш запатрабаваныя кантралёры на кантрольна-прапускным пункце, аператары ПЭВМ, дыспетчары, сакратары, спецыялісты па кадрах, вартаўнікі. У сельскай мясцовасці невысокі попыт на паштальёнаў, швачак. У кожным раёне прапануюць перанавучаць па запатрабаваных прафесіях. Службы занятасці могуць прапанаваць больш за 100 адукацыйных курсаў — па якіх менавіта спецыяльнасцях, залежыць ад рэгіянальнага попыту.

Рост прапаноў ва ўсіх сферах

Значны рост вакансій у параўнанні з мінулымі гадамі абумоўлены паэтапным аднаўленнем эканомікі, стварэннем новых працоўных месцаў на прадпрыемствах, адзначаюць у даследчым цэнтры РАБОТА.TUT.BY. Мяркуецца, што рынак будзе развівацца па такім жа сцэнарыі, як і летась: павелічэнне прапаноў ад наймальнікаў на працягу года, у канцы — невялікае зніжэнне (з-за сезоннасці і падрыхтоўкі да навагодніх свят). Чаканы рост вакансій — 10—15 працэнтаў. Гэтаму будзе спрыяць у тым ліку і Дэкрэт № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва», скіраваны на паляпшэнне бізнес-клімату ў краіне. Новыя перспектывы ў ІТ-галіне адкрые Дэкрэт «Аб развіцці лічбавай эканомікі». А, значыць, новых працоўных месцаў і людзей, якія шукаюць работу ў гэтай сферы, стане больш.

Чвэрць усіх вакансій, размешчаных на сайце рэсурсу, адносяцца да галіны продажаў. Значную долю стабільна займаюць прапановы ў такіх катэгорыях, як інфармацыйныя тэхналогіі, інтэрнэт і тэлекам (13 %), рабочы персанал (11 %), вытворчасць (10 %), транспарт і лагістыка (10 %).

Летась рост вакансій назіраўся ва ўсіх прафесійных сферах. Найбольш прыкметным ён быў у будаўніцтве і нерухомасці (плюс 83 % у адносінах да 2016 года), для рабочага персаналу (плюс 76 %), у аўтамабільным бізнесе (плюс 72 %), вытворчасці (плюс 69 %).

А вось актыўнасць саіскальнікаў можна назваць стабільнай: колькасць рэзюмэ за год павялічылася неістотна. Самы вялікі прырост іх у наступных катэгорыях: навука і адукацыя (плюс 26 % у параўнанні з 2016-м), медыцына і фармацэўтыка (плюс 17 %), рабочы персанал (плюс 11 %), мастацтва, забавы і масмедыя (плюс 9 %), турызм, гасцініцы і рэстараны (плюс 8 %). Спецыялісты менавіта гэтых галін часцей задумваліся пра змену работы.

Канкурэнцыя на рынку працы летась зніжалася і наблізілася да сітуацыі 2014 года — 7,6 рэзюмэ на вакансію (гэта натуральны ўзровень).

Вучыце англійскую мову

Сёлета наймальнікі будуць адчуваць недахоп кваліфікаваных кадраў. Таму кандыдатам варта актыўна вывучаць прапановы аб рабоце і сачыць, якія навыкі і кампетэнцыі запатрабаваны, каб своечасова іх набыць.

— Напрыклад, спецыялісты па продажах заўсёды неабходны, і гэта работа добра аплачваецца. Таму я раіла б асвоіць тэхніку актыўных продажаў. Актуальныя будуць курсы па інтэрнэт-прасоўванні, прасоўванні ў сацыяльных сетках. І, вядома, па англійскай мове, толькі таму, што заробкі такіх работнікаў на 30—50 працэнтаў большыя, чым тых, хто не валодае замежнай мовай, — кажа **дырэктар кансалтынгавай кампаніі «Квадрат» Святлана КАРАСЦЯЛЁВА.**

Па яе словах, цяпер для саіскальнікаў вельмі добры час. Але такая тэндэнцыя (калі колькасць вакансій расце хутчэй, чым база рэзюмэ) хвалепадобная і доўга не пратрымаецца. Таму трэба карыстацца шанцам. Размяшчайце рэзюмэ на сайтах па пошуку работы і абнаўляйце яго хоць бы два разы на тыдзень, каб яно трапляла ў верх спісу.

Складанасці з працаўладкаваннем могуць узнікнуць у прадстаўнікоў масавых прафесій — псіхолагаў, юрыстаў, эканамістаў. Тут выйсце — стаць асам у вузкай спецыялізацыі. Эканаміст з паглыбленым веданнем банкаўскай справы або бухгалтэрыі будзе ў выйгрышы.

Ці варта чакаць прыбаўкі да заробку? «Звычайна аплата працы расце паралельна з поспехамі работніка і яго кампаніі, залежыць ад стану эканомікі ў краіне. Думаю, плаўнае павелічэнне заробкаў будзе назірацца, але рэзкага ўзлёту не прагназую», — дзеліцца Святлана Карасцялёва.

У спісе самых высокааплатных галін застануцца лагістыка, вытворчасць, ІТ (апошняя яшчэ вельмі доўга будзе трымацца ў топе).

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Каб праца была аплачаная

Пры разліку сродкаў, якія падлягаюць пералічэнню па-за чаргой плацяжоў на пагашэнне запазычанасці па заработнай плаце, наймальнікі павінны будуць браніраваць у разліку на аднаго работніка 329,13 рубля. Такі нарматыў прымяняецца з 1 лютага. Па законе, з наймальнікаў, якія маюць запазычанасці па заробках, у бясспрэчным парадку ўтрымліваюцца сумы ў памеры 1,5 бюджэту пражыткавага мінімуму для працаздольнага насельніцтва. БПМ для гэтай катэгорыі, устаноўлены ў цэнах снежня мінулага года, складае 219,42 рубля.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

■ Навіны сталіцы

У метро — на «Штадлеры», па праспекце Пераможцаў — на электробусе

Як будзе змяняцца транспартная сфера Мінска

Летась усе віды транспарту перавезлі ў сталіцы прыкладна 800 мільёнаў пасажыраў. Каля 40 % складаюць паездкі на метро, астатнія прыпадаюць на аўтобусы, тралейбусы, трамваі і зараз ужо электробусы. Але, незалежна ад выбару сродку перамяшчэння, сталічныя транспартнікі працуюць над тым, каб забяспечыць для пасажыраў хуткасць, камфорт і даступнасць.

Дырэктар ДП «Сталічны транспарт і сувязь» Валерый ШКУРАТАЎ расказаў, што на перыяд 2018—2019 гадоў запланавана закупка 300 аўтобусаў, яны папоўняць аўтапарк, а таксама заменяць транспартныя сродкі, тэрмін эксплуатацыі якіх дасягнуў 10 гадоў, — далейшае іх выкарыстанне становіцца небяспечным і немэтазгодным. Акрамя таго, у Мінску з'явіцца яшчэ 60 электробусаў, якія будуць ездзіць пераважна па праспекце Пераможцаў. Прыкладны кошт вялікага электробуса — 950 тысяч рублёў, аўтобуса — 270—340 тысяч рублёў. Прапрацоўваецца пытанне абсталявання іх кандыцыянерамі, аднак гэта ў першым выпадку падымае кошт на 30 %, у другім — на 10 %, таму пакуль аддаецца перавага павелічэнню агульнай колькасці машын.

Шмат транспартных пытанняў трэба вырашыць да ІІ Еўрапейскіх гульняў, бо да месцаў правядзення спаборніцтваў, хутчэй за ўсё, будзе недаступны праезд на аўтамабілях, таму істотная нагрузка ляжа на грамадскі транспарт. У сакавіку пачнецца рэканструкцыя трамвайнай лініі Ульянаўская—Першамайская, якая працягнецца да верасня. Зрабіць пуці закрытага тыпу там не дазваляе шырыня вуліцы, аднак для бяспекі пасажыраў будзе зроблена ўсё магчымае: устаноўлены агароджы па цэнтры, выкарыстана тактыльная плітка, па ходзе маршруту ў многіх месцах забаронены левы паварот для аўтамабіляў. Таксама мадэрнізуюць прыпыначныя пункты, яны будуць выкананы ў новым дызайне, даўжынёй 40—50 метраў, што дастаткова для адначасовага прыбыцця двух трамваяў.

Як адзначыў **намеснік дырэктара па эксплуатацыі ДП «Мінскі метрапалітэн» Андрэй МІХАЙЛОЎСКІ**, плануецца, што ўжо ў 2019 годзе будзе завершана будаўніцтва чатырох новых станцый трэцяй лініі метро, а ў 2020 годзе яна прыме першых пасажыраў. Усе станцыі зробяць закрытага тыпу — абсталяванымі загараджальным шчытом і дзвярыма, якія будуць адкрывацца ў момант спынення цягніка. Дакладна трапляць у патрэбнае месца цягніку дапаможа сістэма аўтакіравання, хібнасць — не больш за 20 см. Абслугоўваць новую лінію стануць саставы кампаніі «Штадлер», дзе будзе магчыма перасоўвацца паміж вагонамі падчас руху. Першы састаў пройдзе абкатку ўжо сёлета, да канца года на ім змогуць праехацца і пасажыры другой лініі метро. Што датычыцца новай веткі, то адным з ноу-хау тут стануць травалатары агульнай працягласцю пяць кіламетраў — так інакш называюць гарызантальныя эскалатары, якія будуць устаноўлены ў пераходах паміж станцыямі. Яшчэ адно новаўвядзенне, якое ўжо дзейнічае на станцыі «Плошча Леніна», — аплата праезду наўпрост банкаўскай карткай — у хуткім часе таксама распаўсюдзіцца на ўсю сетку метрапалітэна.

Па словах **намесніка генеральнага дырэктара ДП «Мінсктранс» Віктара ТОЗІКА**, яшчэ 100 прыпыначных пунктаў сёлета будуць аснашчаны інфармацыйнымі табло, якія зарэкамендавалі сябе з добрага боку. Каб павялічыць хуткасць руху транспарту, у будучыні для яго на ўчастках з высокім трафікам прадоўжаць выдзяляць асобную лінію. Гэта дазваляе скараціць колькасць скаргаў на работу транспарту. Дарэчы, для пасажыраў практычна кругласутачна працуе «гарачая лінія», на якую паступае ў сярэднім каля 60 званкоў у дзень.

Новаўвядзеннем, якое толькі ўступіла у сілу, стала дыферэнцыяцыя штрафаў за безбілетны праезд, яго памер цяпер можа скласці 0,5 або 1 базавую велічыню. Калі пасажыр прызнае сваю віну, то ён павінен аддаць за безбілетны праезд 0,5 б. в. або 12,25 рубля. Калі ж пасажыр адмаўляе факт правапарушэння, які потым атрымліваецца даказаць, то штраф вырасце ўжо да 1 б. в. і складзе 24,5 рубля.

Дар'я КАСКО

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

1 ЛЮТАГА 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 3 (15834)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Валянціна ГАРЦУЕВА:

«З ДЗЯЦІНСТВА ВЕДАЛА: БУДУ АКТРЫСАЙ»

Прыма Купалаўскага тэатра Валянціна Гарцуева ўжо на працягу дзесяцігоддзя іграе вядучыя ролі ў спектаклях, а таксама знялася ў дзясятках фільмаў. Актрыса расказала, як знакамітае прозвішча можа ўскладніць жыццё, а таксама падзялілася прафесійнымі і асабістымі планамі.

— Валянціна, сёння, напэўна, не ўсе гледачы ў тэатры ведаюць, што вы — прадстаўніца адной з самых знакамітых тэатральных дынастый...

— Свайго прадзеда, Глеба Паўлавіча Глебава, які стаў акцёрам Купалаўскага тэатра ў 20-х гадах мінулага стагоддзя, я ведаю толькі па аповедах, кнігах, відэаспектаклях. Яго малодшая дачка і мая бабуля Вольга Глебаўна, выдатная піяністка, канцэртмайстар, была цудоўным чалавекам і для мяне вельмі шмат зрабіла. Калі я нарадзілася, мае бацькі, маладыя акцёры, мелі шмат работы ў тэатры. І бабуля рабіла ўсё, каб са мной займацца. Яна, напрыклад, вадзіла мяне «на музыку». Мне падабаліся духавыя музычныя інструменты. І я вырашыла, што хачу іграць на флейце. Праўда, музычную школу я так і не скончыла...

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

Свой выбар

ВАРТАВЫ ПРЫРОДЫ

БУДНІ МАЛАДОГА ДЗЯРЖІНСПЕКТАРА



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Днямі Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь адзначыла юбілей — 15 гадоў. Штодзень яе работнікі стаяць на варце прыроды. Сярод дзяржінспектараў хапае маладых: кожны шосты — ва ўзросце да 30 гадоў. З адным з іх, Іванам РАДЗЕВІЧАМ, мы і адправіліся ў рэйд.

У РЭЙД — НА ДВОЕ СУТАК

...Дзевяць раніцы. На месцы сустрэчы чамусьці шукаю вачыма старэнькі УАЗік. Але замест яго нас з фатографам падбірае пікап японскай маркі. Нечакана.

— Аўтапарк абнавілі. «Буханак» ужо практычна не засталося: для пагоняў за браканьерамі, якія раз'язджаюць на джыпах, гэта не самая прыдатная машына, — тлумачыць старшы дзяржінспектар Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету Іван Радзевіч, а мы заскокваем у пікап.

У дарозе 23-гадовы хлопец расказвае пра сябе. Па адукацыі ён юрыст: скончыў Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО». Пасля працаваў судовым выканаўцам. У той прафесіі, заўважае Іван, можна атрымаць шмат юрыдычнага вопыту. Але большую частку часу аднімалі не абходы даўжнікоў, а папяровая работа. Сядзець у кабінеце хлопцу не хацелася. Таму праз тры месяцы ён звольніўся і, калі ўбачыў вакансію дзяржінспектара, якая абяцала шмат руху і прыгод, вырашыў паспрабаваць сябе ў новай прафесіі.

Спачатку — стажыроўка. Месяц Іван ездзіў у рэйды ў якасці грамадскага інспектара. Пасля трапіў у штат. Па заканчэнні выпрабавальнага тэрміну хлопца чакаў экзамен. Для гэтай работы трэба ведаць заканадаўства ў сферы аховы прыроды і быць фізічна падрыхтаваным. З апошнім у Івана праблем няма: у школьныя гады ён займаўся веславаннем і мае званне кандыдата ў майстры спорту.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Давяральная размова

ІНТЫМНЫ ПРАБЕЛ

Як яго правільна запоўніць падлетку

Кожны год у Беларусі каля тысячы дзяўчат становяцца мамамі да паўналецця. Ці можа сексуальная асвета вырашыць гэтую праблему? У краіне ёй пакуль займаюцца хутчэй факультатыўна, чым у абавязковым парадку. Бацькі часцяком перакладаюць няёмкія размовы на школу, школа — на бацькоў, а самі падлеткі тым часам шукаюць патрэбную інфармацыю ў інтэрнэце, які не заўсёды дае дакладныя звесткі.

Практыка паказвае, што змагацца з падлеткавымі цяжарнасцямі, палавымі захворваннямі і яшчэ мноствам праблем пераходнага ўзросту рэальна дапамагае толькі інфармаванне. Ім якраз і займаецца наша суразмоўніца — **урач-валеолаг Рэспубліканскага інфармацыйна-метадычнага рэсурснага цэнтра «Ювентус» Інэса ПАЛАЗНІК.** Калі сваімі словамі, яна — спецыяліст па здаровым ладзе жыцця, займаецца не толькі пытаннямі фізічнай актыўнасці, правільнага харчавання і шкодных звычак. Падлеткавы валеолаг і пра дэпрэсію пагаворыць, і пра анарэксію, і карыстацца індывідуальнымі сродкамі засцярогі ад інфекцый навучыць.

«Цэнтры, дружалюбныя падлеткам», дзе працуюць такія спецыялісты, з'явіліся па ўсёй Беларусі і ў суседніх краінах пры падтрымцы ЮНІСЕФ. Галоўная іх мэта — дапамагчы маладым людзям захаваць здароўе і вырашыць праблемы, з якімі не пойдзеш ні да настаўнікаў, ні да бацькоў. Зараз у краіне 50 такіх цэнтраў, з іх 8 — у сталіцы. Прыйсці туды па дапамогу можна ў любы момант, але пакуль пра гэтую магчымасць ведаюць не ўсе падлеткі. А з тых, хто ведае, далёка не кожны наважваецца шчыра выказаць пытанні і думкі.

У «Ювентусе» дапамагаюць дзецям яшчэ і педыятр, і нарколаг, і гінеколаг з псіхолагам. Да апошняга спецыяліста старшакласніцы, па словах Інэсы Палазнік, могуць прыходзіць пагаварыць хоць пяць разоў на дзень. Але іх не так шмат, як магло б быць, бо нават проста расказаць падлеткам пра існаванне такіх цэнтраў, як «Ювентус», згаджаецца далёка не кожная школьная адміністрацыя. А абавязковай «праграмы палавой адукацыі» ў Беларусі ўсё яшчэ няма.



— Мы можам толькі запрасіць падлеткаў на гасцявы ўрок, — тлумачыць валеолаг. — Кожны год, кожны квартал адсылаем запыты, каб па школах і каледжах распаўсюдзілі інфармацыю пра цэнтр, запрашаем на лекцыі і семінары. Стараемся, каб першы ўрок палавога выхавання быў не ў школе, а тут, і як мага раней — у 11 гадоў. Па статыстыцы нашага цэнтра, у дзяўчатак уступленне ў палавое жыццё можа адбыцца ўжо ў 13 гадоў. А мамам казаць пра гэта яны баяцца і саромеюцца.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
1 02 2018 г.

Бачыць мэту

«УНІВЕРСІТЭТ 3.0»: РЫВОК ДА НОВАЙ МАДЭЛІ

Як змяняецца «ландшафт» вышэйшай школы?

Магчымасці і ўклад універсітэцкіх тэхнапаркаў у развіццё мадэлі «Універсітэт 3.0» кіраўніцтва Міністэрства адукацыі абмеркавала з маладымі навукоўцамі падчас семінара, які прайшоў на базе навукова-тэхналагічнага парка БНТУ «Палітэхнік».

ПІЛОТНЫ ПРАЕКТ

Трэба растлумачыць, што пад мадэллю «Універсітэт 3.0» маецца на ўвазе, у першую чаргу, стварэнне інтэграванага адукацыйнага, навукова-даследчага і прадпрымальніцкага асяроддзя, адзінства сістэмы «адукацыя — навука — інавацыя — камерцыялізацыя». Усе ўніверсітэты, якія ўваходзяць у сусветных рэйтынгах у топ-10 і нават у першую сотню, уяўляюць сабой магутныя навукова-адукацыйныя карпарацыі, цэнтры навуковых ведаў і генератары інавацыйнага развіцця. Сучасны ўніверсітэт ужо апрыёры не можа займацца толькі падрыхтоўкай кадраў. Гэта агульнасусветны трэнд, які нельга ігнараваць.

— Я лічу, што ў Беларусі створаны ўсе ўмовы для рэалізацыі мадэлі «Універсітэт 3.0»: сёння нашы ўніверсітэты займаюцца не толькі адукацыяй і навуковымі распрацоўкамі, але і прасоўваюць свае праекты ў эканоміку і іншыя сферы, — падзяліўся сваімі думкамі з удзельнікамі мерапрыемства **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.** — Міністэрствам адукацыі **ў рамках пілотнага праекта вызначана шэсць ВНУ: БДУ, БНТУ, БДУІР, БДТУ і БДЭУ, а таксама ГрДУ імя Янкі Купалы, якім даручана распрацоўка і рэалізацыя эксперыментальнага праекта па ўкараненні новых падыходаў у развіццё вучэбнай, навуковай і прадпрымальніцкай інфраструктуры ўніверсітэта.** Змены ў адукацыйным працэсе будуць рэалізаваныя ў наступным навучальным годзе, але ўжо цяпер мы павінны пастарацца выйсці на канкрэтныя рашэнні, уключаючы ўдасканаленне нарматыўна-прававой і заканадаўчай базы.

Вусцілкі «Кінезіа» — распрацоўка Цэнтра адаптыўнай кінезітэрапіі (рэзідэнта тэхнапарка БНТУ).

Міністр падкрэсліў, што ў найбліжэйшай перспектыве маладзёжнай навуковай супольнасці трэба будзе ўнесці непасрэдны ўклад у пераўтварэнне Беларусі ў ІТ-краіну. Таксама вузаўскай навуцы трэба будзе паглыбіць і пашырыць фундаментальныя і прыкладныя даследаванні па прыярытэтных напрамках навукова-тэхнічнай дзейнасці, як гэта робіцца ва ўніверсітэтах многіх краін свету, у тым ліку шляхам стварэння навукова-адукацыйна-вытворчых кластараў, якія прадугледжваюць інтэграцыю адукацыйных устаноў і прадпрыемстваў.

Ужо цяпер наладжана ўзаемадзеянне ўніверсітэцкай навукі і вытворчых прадпрыемстваў. Сумесныя навуковыя даследаванні праводзяцца на базе дзевяці галіновых лабараторый, адкрытых у інтарэсах лясной, хімічнай, харчовай прамысловасці і прыборабудавання.

Для якаснага правядзення навуковых даследаванняў і распрацовак ва ўстановах вышэйшай адукацыі створана інавацыйная інфраструктура, якая ўключае шэсць навукова-тэхналагічных паркаў і 15 цэнтраў трансферу тэхналогій.

Ігар Карпенка паведаміў, што летась быў адкрыты першы ў краіне студэнцкі інавацыйны цэнтр прафесійнага развіцця — бізнес-інкубатар БДУІР, які ўяўляе сабой платформу для стварэння і развіцця перспектыўных інавацыйных праектаў і далейшага іх прасоўвання на рынак. Яшчэ адзін прыклад стымулявання маладзёжнага інавацыйнага прадпрымальніцтва — досвед работы стартап-цэнтра ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце «Ад ідэі да ўкаранення».

— І гэта толькі пачатак маштабнай работы па развіцці інавацыйнай інфраструктуры, у якую трэба будзе ўключыцца ўсім універсітэтам, — падкрэсліў міністр адукацыі. — Акрамя таго, для рэалізацыі мадэлі «Універсітэт 3.0» установам вышэйшай адукацыі неабходна стварыць навукова-адукацыйную платформу, якая дазваляе вывучаць і асвойваць новыя і перспектыўныя тэхналогіі апрацоўкі і перадачы даных, выконваць навуковыя даследаванні і распрацоўкі па базавых інфармацыйных тэхналогіях, распрацоўваць і ствараць высокапрадукцыйныя праграмна-апаратныя комплексы і інфармацыйныя сістэмы ў мэтах развіцця інфармацыйнага грамадства і лічбавай трансфармацыі эканомікі.

Мы павінны разумець, што **поспех рэалізацыі мадэлі «Універсітэт 3.0» дазволіць стварыць у найбліжэйшай будучыні высокаінтэлектуальнае матываванае асяроддзе для трансфармацыі ВНУ ў мадэль «Універсітэт 4.0».** Гэта самая перспектыўная мадэль для развіцця перадавых універсітэтаў, якая абавязкова павінна ўключаць акрамя адукацыі, навукі і інавацый яшчэ і стварэнне крэатыўнага асяроддзя. Інжынеры, якіх будуць тут рыхтаваць, змогуць вырашаць найскладанейшыя задачы, якія па розных прычынах не па сілах ні карпарацыйнай, ні акадэмічнай навуцы.

ПЕРСПЕКТЫВЫ ДЛЯ НАВУКОВАЙ КАР'ЕРЫ

— Для дасягнення пастаўленай мэты Мінадукацыі надае асаблівую ўвагу падтрымцы навуковай кар'еры маладых людзей, — запэўніў міністр. — Сёння аспірантура адкрыта ў 26 установах вышэйшай адукацыі па 233 спецыяльнасцях, дактарантура — у 15 ВНУ па 180 спецыяльнасцях.

Усяго ў 2017 годзе ў аспірантуры навучалася 2747 чалавек, у дактарантуры — 142 чалавекі. Летась у параўнанні з 2016 годам выпуск з аспірантуры з папярэдняй экспертызай дысертацыі павялічыўся да 20 % (у 2015 г. было 16 %, у 2016 г. — 18,4 %), а з абаронай дысертацыі ў тэрмін навучання — да 6,6 % (у 2015 г. — 2,9 %, 2016 г. — 5,2 %).

На думку міністра адукацыі, станоўчыя вынікі дасягнуты дзякуючы створанай у краіне сістэме стымулявання і прыцягнення ў навуку таленавітай моладзі. Так, у 2017 годзе стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь атрымалі 94 маладыя навукоўцы, у тым ліку 25 — з установ адукацыі і арганізацый сістэмы Міністэрства адукацыі. Таксама па выніках конкурсу дактарантам, аспірантам і студэнтам на выкананне навукова-даследчых работ Міністэрства адукацыі выдала 100 грантаў на агульную суму 350 000,0 рубля.

АД ІДЭІ — ДА БІЗНЕСУ

У тэхнапарку БНТУ «Палітэхнік» навуку пераўтвараюць у бізнес ужо 25 гадоў — гэта найстарэйшы ў краіне ўніверсітэцкі тэхнапарк. Пляцоўка была створаная адмыслова для таго, каб ідэі і тэхналогіі, народжаныя на кафедрах і ў лабараторыях, вырасталі да вытворчасці, камерцыялізацыі і маштабіравання. За гэты час у парк удалося прыцягнуць 20 рэзідэнтаў і распачаць рэалізацыю 50 унікальных праектаў. Быў створаны цэлы шэраг прадпрыемстваў і вядомых брэндаў — ад «Полімедтэха», чые медыцынскія вырабы выкарыстоўваюць у паўсядзённай практыцы нашы кардыяхірургі і артапеды-траўматолагі, да дызайн-цэнтра машыннай вышыўкі Fainy.by. Летась структуру тэхнапарка папоўніў міжнародны інавацыйны цэнтр.

— Сёння наш тэхнапарк суправаджае поўны навукова-інавацыйны цыкл ва ўніверсітэце: ад фундаментальных і прыкладных даследаванняў да заснавання новых інавацыйных прадпрыемстваў і высокатэхналагічных вытворчасцяў, — кажа **намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу навукова-тэхналагічнага парка «Палітэхнік» Віталь ГМЫРАК.** — Толькі за апошнія гады нашым тэхнапаркам былі створаны шэсць інавацыйных прадпрыемстваў, а гэта новыя высокакваліфікаваныя рабочыя месцы, тэхналагічны экспарт. Пры гэтым абсалютна відавочная важнасць такой структуры для вучэбнага працэсу ва ўніверсітэце, калі ёсць магчымасць сумеснага выкарыстання навукова-вытворчага абсталявання, памяшканняў рознага функцыянальнага прызначэння. У адрозненне ад класічнага тэхнапарка, як выключна камерцыйнай структуры тэхнапарк БНТУ актыўна ўдзельнічае ў выхаванні інжынерных кадраў як будучай бізнес-эліты.

Медыцынскія вырабы, створаныя ў тэхнапарку «Палітэхнік», выкарыстоўваюць у паўсядзённай практыцы кардыяхірургі. Адна з распрацовак — біялагічны эндапратэз клапанаў сэрца.

У парк удалося прыцягнуць 20 рэзідэнтаў і распачаць рэалізацыю 50 унікальных праектаў.

Студэнты БНТУ маюць рэальную магчымасць наўпрост кантактаваць з інавацыйнымі тэхналогіямі, вытворчасцю і непасрэдна з рынкам. Так, кожны год на базе «Палітэхніка» больш як сто студэнтаў розных спецыяльнасцяў праходзяць вытворчую практыку, якая затым кладзецца ў аснову курсавых і дыпломных работ. Многія з іх становяцца супрацоўнікамі тэхнапарка, а некаторыя нават заснoўваюць свае прадпрыемствы. Праекты «ТурбаСфера» і Fainy.by — прыклады таго, як ідэі будучага бізнесу нараджаліся яшчэ падчас студэнцтва.

Тэхнапаркі дапамаюць развіваць таксама і матэрыяльна-тэхнічную базу ўніверсітэта, паколькі прыцягваюць інвестыцыі пад будаўніцтва і рэканструкцыю будынкаў і збудаванняў, а таксама пад набыццё сучаснага навукова-тэхналагічнага абсталявання, якое ў далейшым можа выкарыстоўвацца і ў навукова-адукацыйным працэсе ўніверсітэта.

НАВУКА — СПОРТУ

Сапраўдны тэхналагічны допінг для беларускіх спартсменаў ствараецца сёння сіламі кафедры спартыўнай інжынерыі і Цэнтра адаптыўнай кінезітэрапіі (рэзідэнта тэхнапарка БНТУ). Адна з іх распрацовак — вусцілкі «Кінезіа». Карэкцыя парушэнняў біямеханікі апорна-рухальнага апарату спартсменаў ажыццяўляецца з дапамогай выкарыстання індывідуальных адаптаваных кінезітэрапеўтычных вусцілак, якія вырабляюцца на ўласнай высокатэхналагічнай лініі. Ключавым адрозненнем айчыннай тэхналогіі стаў запуск праграмы аб'ектыўнай ацэнкі прасторавай кінематыкі тазавага рэгіёна, якая дазваляе вызначаць асіметрыю ніжніх канечнасцяў спартсменаў пры ўзаемадзеянні з апорай. Сэнсарныя датчыкі, якія ўкладваюцца ў кінезітэрапеўтычную вусцілку, дазваляюць адсочваць, як размяркоўваецца ціск па стапе чалавека, ці ёсць паляпшэнні.

Па заказе Міністэрства спорту і турызму кафедра спартыўнай інжынерыі супрацоўнічае з нацыянальнымі камандамі па веславанні на байдарках і каноэ, цяжкай мужчынскай атлетыцы. Так, напрыклад, снарады для апошняй аснашчаюцца спецыяльнымі датчыкамі інтэлектуальных рухаў (мікраэлектроніка замацоўваецца ў кліпсе). Апошнія дазваляюць спартсменам з дапамогай адмысловай камп'ютарнай праграмы шліфаваць кожны свой рух, паколькі падчас штуршка літаральна кожны кілаграм мае значэнне. Такія ж датчыкі, якія вызначаюць у тым ліку і хуткасныя характарыстыкі, устанаўліваюцца і на вясло.

Падводзячы вынікі сустрэчы, Ігар Карпенка падкрэсліў, што ВНУ не могуць заставацца проста ўстановамі адукацыі, ім усім трэба здзейсніць рывок да новай мадэлі, прычым вельмі імклівы: «Калі мы жадаем заставацца суверэннай краінай, то пры адсутнасці прыродных рэсурсаў, за кошт якіх можна яшчэ некалькі дзясяткаў гадоў выжываць, нам трэба намацаць пункты, якія дазволяць эфектыўна развівацца і ісці наперад, а мы можам разлічваць толькі на свой інтэлект», — дадаў міністр адукацыі.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

❍ Гістарычная даведка

Першым у свеце лічаць тэхнапарк, створаны на пачатку 50-х гадоў XX стагоддзя ў Каліфорніі пры Стэнфардскім універсітэце. Але фактычна пачынаўся ён яшчэ раней. Прафесар Фрэдэрык Тэрман, шматгадовы прарэктар Стэнфарда, быў адным з тых, хто спрабаваў утрымаць у рэгіёне выпускнікоў мясцовых універсітэтаў, якія ў пошуках працы з'язджалі ва ўсходнія штаты. Так і ўзнікла ідэя будаўніцтва на вялікай тэрыторыі ўніверсітэта новых памяшканняў, якія на льготных умовах здаваліся б у арэнду гатовым адкрыць уласны бізнес маладым інжынерам. У выніку тут сфарміраваўся цэлы высокатэхналагічны рэгіён, які атрымаў пазней назву «Крэмніевая даліна» з лёгкай рукі амерыканскага журналіста Дона Хофлера. Стэнфардскі індустрыяльны парк, які спалучыў акадэмічную навуку з прамысловасцю дзеля атрымання высокатэхналагічных ведаў, стаў калыскай, з якой выйшлі самыя лепшыя розумы ў гэтай сферы.

А ў Еўропе першыя тэхнапаркі ўзніклі ў пачатку 70-х гадоў у Вялікабрытаніі, Бельгіі і Францыі.

Візітная картка дызайнерскай вышыўкі Fainy.by — рэчы з беларускімі матывамі.

Рука дапамогі

БРСМ ДА ВЫБАРАЎ АДКРЫЎ ГАРАЧЫЯ ЛІНІІ

І плануе задзейнічаць падчас іх валанцёраў

Гарачыя лініі па аказанні дапамогі маламабільным выбаршчыкам працуюць пры абласных і Мінскім гарадскім камітэтах Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

З просьбай аказаць дапамогу ў суправаджэнні людзей з абмежаванымі магчымасцямі на выбарчыя ўчасткі ў дзень выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў, 18 лютага, і дні датэрміновага галасавання можна звярнуцца ў рэгіянальныя аддзяленні валанцёрскага руху БРСМ «Добрае Сэрца». Для гэтага неабходна пакінуць папярэднія заяўкі, патэлефанаваўшы па нумарах у Брэсце — 8 (0162) 21 15 92, Віцебску — 8 (0212) 66 20 87, Гомелі — 8 (0232) 60 15 57, Гродне — 8 (0152) 72 20 96, Магілёве — 8 (0222) 76 67 51 і 8 (0222) 76 64 49, Мінскай вобласці — 8 (017) 289 15 28, Мінску — 8 (017) 284 85 54. Плануецца, што гарачыя лініі будуць працаваць і пры тэрытарыяльных камітэтах БРСМ.

Акрамя таго, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі плануе задзейнічаць для дзяжурства на ўчастках падчас выбараў больш за 4,5 тысячы валанцёраў «Добрага Сэрца». Добраахвотнікі БРСМ у рамках сваёй кампетэнцыі акажуць неабходнае садзейнічанне ў перамяшчэнні інвалідаў, людзей пажылога ўзросту, маці з маленькімі дзецьмі ў каляскach і іншым грамадзянам, хто мае патрэбу ў дапамозе.

Нягледзячы на тое, што вопыт работы на выбарах у валанцёраў БРСМ ёсць, Саюз моладзі выйшаў з ініцыятывай правядзення шэрагу сустрэч з грамадскімі аб'яднаннямі «Беларускае таварыства інвалідаў», «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» і іншымі зацікаўленымі ў арганізацыі работы добраахвотнікаў на ўчастках, у тым ліку па іх навучанні.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У ліку найлепшых

«ЗОАГАСЦІНІЦА» ЦІ «ШКОЛА ДАБРА»?

На Гомельшчыне вызначалі пераможцаў абласнога этапу «100 ідэй для Беларусі»

Чарговы абласны этап рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі», які праводзіцца па ініцыятыве і пад эгідай БРСМ, вітала Гомельшчына. Яго ўдзельнікі — прадстаўнікі навуковай, студэнцкай і працоўнай моладзі, школьнікі — прадставілі ў канферэнц-зале СЭЗ «Гомель-Ратон» больш за 20 аўтарскіх праектаў — пераможцаў раённых адборачных этапаў.

Сярод іх распрацоўка «Праграмнае і метадычнае забеспячэнне — як аснова прагназавання энергаэфектыўнасці сістэм гарадскога водазабеспячэння і водаадвядзення» аўтара Аляксея Капанскага з Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П. В. Сухога, асістэнта кафедры электразабеспячэння. Свой праект «Зоагасцініца» прэзентавалі студэнты Віялета Кохан і Аляксандр Карповец з Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна. Работу «Вырошчванне сеянцаў дуба чарэшчатага з закрытай каранёвай сістэмай» прадставіў Дзмітрый Захаранка, магістрант той жа навучальнай установы. З дабрачынным сацыяльным праектам школы падрыхтоўкі валанцёраў «Школа Дабра» прыехала на абласны этап конкурсу культарганізатар Вераніка Ражкова з Гомельскага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. «Сімулятарам-накладкай для адпрацоўкі ўнутрывенных ін'екцый і забору крыві» здзіўляў Алег Дохаў, выкладчык кафедры ваеннай і экстрэмальнай медыцыны Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, а «Аўтаматычныя вонкавыя дэфібрылятары» прадставіла Анастасія Прадко, студэнтка гэтай жа ВНУ. Былі і іншыя праекты, якія ахоплівалі ўсю сферу жыццядзейнасці.

Экспертамі выступалі кіраўнікі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта, Цэнтральнага камітэта ГА «БРСМ», Гомельскага тэхнапарка, Гомельскага абласнога клінічнага шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, бізнес-школы ІПМ і іншыя прадстаўнікі профільных сфер і бізнес-супольнасці.

Кожнаму аўтару праекта было прапанавана за 30 секундаў прэзентаваць сваю распрацоўку, тым самым зацікавіўшы ўласнай ідэяй наведвальнікаў выстаўкі і экспертаў. У канцы мерапрыемства ім далі яшчэ адну магчымасць у рамках абароны ініцыятыў на працягу трох хвілін расказаць пра сваю задуму. Па выніках прэзентацый экспертны савет выбраў найлепшыя ініцыятывы па намінацыях, якія прадставяць Гомельскую вобласць на рэспубліканскім этапе конкурсу «100 ідэй для Беларусі».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Інтэлект і інавацыі

МАГІСТРАЛЬ ВІТАЕ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ

Гэты конкурс праводзіцца ўжо другі раз. Ён арганізаваны з мэтай выяўлення інтэлектуальных і творчых здольнасцяў моладзі, а таксама ўкаранення на магістралі інавацыйных ідэй і праектаў, якія прадстаўляюць практычны інтарэс.

Інтэлектуальнае спаборніцтва праводзіцца ў трох намінацыях: «Найлепшая маладзёжная ініцыятыва, скіраваная на павышэнне бяспекі руху цягнікоў, перавозкі грузаў і пасажыраў», «Найлепшая маладзёжная ініцыятыва, скіраваная на павышэнне прадукцыйнасці працы, рацыянальнае выкарыстанне працоўных рэсурсаў, эканомію паліўна-энергетычных і матэрыяльных рэсурсаў» і «Найлепшая маладзёжная ініцыятыва, скіраваная на забеспячэнне аховы навакольнага асяроддзя, а таксама на павышэнне ўзроўню тэхнікі бяспекі і аховы працы на вытворчасці».

У конкурсе могуць прыняць удзел прадстаўнікі працоўнай моладзі арганізацый і адасобленых структурных падраздзяленняў Беларускай чыгункі ва ўзросце да 31 года ўключна, а таксама навукова-вытворчыя калектывы, якія складаюцца з маладых людзей ва ўзросце да 31 года ўключна.

Матэрыялы для ўдзелу ў конкурсе маладзёжных ініцыятыў неабходна прадставіць ва ўпраўленне Беларускай чыгункі не пазней за 16 лютага на папяровым і электронным носьбітах.

Маладзёжная ініцыятыва павінна змяшчаць электронную візітоўку (графічны малюнак у JPG-фармаце з разрозненнем не менш за 800х600px, які ілюструе сутнасць маладзёжнай ініцыятывы) і кароткае апісанне (мэты і задачы маладзёжнай ініцыятывы, аналіз узнятай праблемы, вынікі даследаванняў і (або) апісанне практычных распрацовак, а таксама адпаведныя дадаткі (фота- і відэаматэрыялы, графікі, табліцы, мультымедыйныя прэзентацыі і інш., афармленыя ў адвольнай форме).

Вынікі конкурсу падвядуць у сакавіку, пераможцы будуць узнагароджаны памятнымі дыпломамі і грашовымі прэміямі. Заснавальнікі творчага спаборніцтва — Беларуская чыгунка, Аб'яднаная галіновая прафсаюзная арганізацыя чыгуначнікаў і транспартных будаўнікоў і галіновы камітэт БРСМ.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прэч руціну!

Рэктарат выклікалі на... лыжню

Звыш 500 студэнтаў Белдзяржуніверсітэта адзначылі заканчэнне зімовай сесіі і надыход канікулаў у спартыўна-аздараўленчым комплексе «Лагойск».

Удзельнікамі маштабнай акцыі сталі таксама кіраўнікі і выкладчыкі ўніверсітэта. Усіх (і студэнтаў, і работнікаў універсітэта) чакала лыжная эстафета.

— Заканчэнне сесіі — добрая нагода напоўніць гэтую падзею яркімі эмоцыямі і ўражаннямі, а таксама карыснымі фізічнымі нагрузкамі, — падкрэсліў рэктар БДУ Андрэй Кароль. — Вельмі радуе, што і нас, сваіх настаўнікаў, студэнты запрасілі на гэтае свята.

У спартыўнай гонцы барацьба разгарнулася паміж камандамі «Рэктарат», «Дэканат», «Работнікі» і «Студэнты». Інтрыга вырашылася на карысць студэнцкай зборнай, якая фінішавала першай. Другой завяршылі эстафету прадстаўнікі «Рэктарата»: у складзе гэтай каманды выступалі рэктар БДУ Андрэй Кароль, прарэктар па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях Вольга Чупрыс, прарэктар па эканоміцы і матэрыяльна-тэхнічным развіцці Міхаіл Чарапеннікаў і кіраўнік аддзела па рабоце з моладдзю Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы Максім Логвінаў. «Бронзу» заваявала каманда «Работнікаў».

Сюрпрызам для гасцей мерапрыемства стала сустрэча з майстрам спорту міжнароднага класа, чэмпіёнкай Еўропы, 11-разовай чэмпіёнкай свету па летнім біятлоне Вольгай Назаравай. Падчас майстар-класа спартсменка расказала пра свае перамогі, першыя медалі і спартыўную кар'еру.

У гэты дзень на пляцоўках спартыўна-аздараўленчага комплексу працавалі таксама зоны актыўнасці, дзе ўсе ахвотныя маглі праверыць свае сілы ў ціры, у барацьбе сумо, атракцыёне «вялікі футбол» і іншых. Таксама для ўдзельнікаў мерапрыемства прайшлі шматлікія розыгрышы і конкурсы.

Арганізатарам мерапрыемства выступіла Пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Пацэліць у яблычак

«Снежны снайпер»: спаборніцтвы трапных і хуткіх

Другі этап рэспубліканскіх спаборніцтваў па біятлоне сярод дзяцей і падлеткаў «Снежны снайпер» на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба пройдзе ў пачатку лютага.

Першымі наймацнейшых вызначаць юныя біятланісты Брэсцкай вобласці, якія будуць спаборнічаць сёння на лыжароллернай трасе агракамбіната «Мір» у Баранавіцкім раёне. Услед за імі абласныя спаборніцтвы пройдуць у астатніх рэгіёнах краіны. У Мінску старты «Снежнага снайпера» адбудуцца 6—8 лютага на трасе ў Вяснянцы.

Рэспубліканскія спаборніцтвы «Снежны снайпер» — адзін з самых маштабных і паспяховых праектаў Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. З моманту свайго нараджэння ў 2007 годзе спаборніцтвы занялі лідзіруючую пазіцыю па масавасці ўдзелу сярод падобных турніраў. Толькі ў першым «Снежным снайперы» на старты выйшлі больш за 200 тысяч хлопцаў і дзяўчат з усёй краіны. У спаборніцтвах удзельнічаюць аматары біятлона, якія не адносяцца да спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў. Юныя спартсмены будуць спаборнічаць у трох узроставых групах: малодшай (11—12 гадоў), сярэдняй (13—14 гадоў) і старэйшай (15—16 гадоў). Спачатку яны выйдуць на старты ў рамках школьных, раённых і абласных этапаў «Снежнага снайпера», а самыя трапныя і хуткія будуць змагацца за ўзнагароды ў рэспубліканскім фінале.

Фота БЕЛТА.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
1 02 2018 г.

ВАРТАВЫ ПРЫРОДЫ

Работа на прыродзе — гэта яшчэ і магчымасць палюбавацца краявідамі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Рэйд у інспектараў цягнецца два дні. Начуюць у машыне. Спачатку, прызнаецца Іван, было цяжка прывыкнуць да новага графіка. Дый спаць у аўто не тое самае, што ў дамашнім ложку. Але праз два тыдні адаптаваўся.

З экіпіроўкі ў інспектараў бінокль, компас (хоць часцей карыстаюцца картамі на смартфоне), прыборы начнога бачання, наручнікі, аўтаматы. У групе — у яе складзе тры і больш чалавек — мінімум двое мусяць быць узброены.

— Я працую тут восем месяцаў. Прымяняць аўтамат, на шчасце, яшчэ не даводзілася. Наша галоўная зброя — слова. Размаўляем з правапарушальнікамі тактычна і ветліва. Не заўсёды, вядома, праходзіць гладка. Некаторыя пачынаюць біцца ці спрабуюць уцячы. Многія стараюцца падмануць, каб пазбегнуць адказнасці. Прыдумваюць розныя адгаворкі: забыўся, не ведаў, — дзеліцца Іван.

РЫБАКІ МАРОЗУ НЕ БАЯЦЦА

На кантролі — тэрыторыі, дзе найбольш часта здзяйсняюцца правапарушэнні. Адна з такіх «гарачых кропак» — Мінскае мора. Там і спыняемся. Кіроўца застаецца ў машыне, а мы кіруемся да рыбакоў.

Выходзім на лёд. Па шчырасці, я ўпершыню ў жыцці рызыкнула прагуляцца па замёрзлым вадаёме. Бо, па-першае, у дзень нашага дзяжурства раніцай было 16 градусаў марозу і таўшчыня лёду перавышала 15 сантыметраў, а па-другое — ну чаго хвалявацца, калі ў цябе такое суправаджэнне?

Інспектар правярае, ці ўсе рыбачаць па правілах. Так, для лоўлі шчупака чалавек можа выкарыстоўваць не больш за пяць прылад — ставак (ці не больш за дзесяць — для членаў Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў). Усе яны мусяць быць падпісаны. Пакідаць стаўкі без нагляду нельга.

Сёння ўсё ў парадку. Акрамя аднаго — не клюе.

— Вось усё, што трапляецца на кручок, — паказвае нам мужчына рыбінку даўжынёй сантыметраў пяць.

— І доўга вы сядзець тут будзеце? — пытаюся ў рыбака і нацягваю капюшон.

— Да вечара.

— У такі мароз?!

— У мяне вунь палатка стаіць, буду грэцца. Там і канфорка ёсць, каб прыгатаваць гарачанькага паесці.



Нарыхтоўка лесу — толькі па дакументах.

Аднаму рыбаку нарэшце пашанцавала — выцягнуў з лункі шчупака кілаграма паўтара вагой. Пакуль вяртаемся да машыны, высвятляем, што Іван таксама захапляецца рыбалкай. Па ўлоў ездзіць у мясціны, знаёмыя з дзяцінства, — у Барысаўскі раён, дзе жывуць яго сваякі.

КАЛІ ЧАКАЕШ У ЗАСАДЗЕ

Далей па маршруце — лясгасы Пухавіцкага раёна. У канцы студзеня, калі праходзіў наш рэйд, было адкрыта паляванне на зайца і аленя. Хобі гэта не з танных. Так, за аднаго здабытага аленя ў Мінскай вобласці неабходна заплаціць 900 рублёў, а калі ён трафейны (у такіх жывёл чатыры і больш адростка ў на кожным рагу) — 1200. Але адчуйце розніцу: здабыты незаконна, той жа алень абыдзецца ў 7350 рублёў.

Іван прызнаецца: раней не думаў, што ва ўгоддзях Міншчыны вядзецца столькі звяроў. Падчас рэйдаў хлопец бачыў казуль, ласёў, зайцоў, дзікоў.

Збочваем на машыне да лесу. Інспектары прыглядаюцца, ці ёсць свежыя сляды — воза, чалавека, сабакі. Калі ёсць, ідуць праверыць, што адбываецца на месцы. За дзень даводзіцца намотваць нямала кіламетраў. «Затое з такой работай не патаўсцееш», — смяецца Іван.

Яны з калегам, дарэчы, за некалькі дзён да нашага сумеснага рэйду затрымалі ў Смалявіцкім раёне двух браканьераў. У іх была пуцёўка на здабычу пушнога звера, але ў кішэнях у мужчын знайшлі кулі і карцеч. Значыць, яны мелі намер падстрэліць больш буйную жывёлу, бо пры паляванні на зайца можна выкарыстоўваць толькі шрот (шарыкі дыяметрам да пяці міліметраў). Цяпер правапарушальнікам належыць выплаціць штраф — ад 20 да 50 базавых велічынь (гэта мінімум 490 рублёў).

Нярэдка інспектарам даводзіцца чакаць у засадзе. Калі паляўнічы яшчэ ў лесе, праз нейкі час абавязкова раздасца стрэл ці брэх сабакі. Іван успамінае, як аднаго браканьера, калі той спрабаваў уцячы, падвяла тэхніка. Мужчына ўскочыў на матацыкл, але не змог яго завесці. У бульбяным меху, які нёс паляўнічы, аказаўся вялізны капкан. Затрыманы спрабаваў апраўдацца, што хацеў здабыць бабра, але памер капкана яўна быў разлічаны на некага больш буйнога.

Іван прызнаецца: раней не думаў, што ва ўгоддзях Міншчыны вядзецца столькі звяроў. Падчас рэйдаў хлопец бачыў казуль, ласёў, зайцоў, дзікоў. «А вось мядзведзяў не сустракаў. Хоць, кажуць, яны бываюць у лясах Лагойскага раёна».

А яшчэ інспектары натыкаюцца на... закаханыя парачкі. Усё ж такі лес — не самае лепшае месца для спатканняў.

НА ГУК БЕНЗАПІЛЫ Ў ЛЕСЕ

Выязджаючы з лесу, заўважаем мясцовых жыхароў, якія нарыхтоўваюць дровы. Спыняемся, каб праверыць, ці ёсць на гэта адпаведныя дакументы з дазволам.

— Мы ж нічога дрэннага не робім. Наадварот, лес чысцім — звозім сухастой і паламаныя дрэвы, — інспектараў з аўтаматамі мужыкі спачатку ўспрынялі ў штыкі. Але, калі зразумелі, што гэта штатная праверка, расслабіліся. Нават расказалі пра сваю кабылу, якая «пазіравала» для некалькіх гарадскіх скульптур, што цяпер стаяць у розных кутках Беларусі.

Старшы дзяржінспектар Іван Радзевіч правярае, ці ўсе рыбачаць па правілах.

Дакументы знайшліся. Іван пазней расказаў, што буйныя правапарушэнні па нарыхтоўцы лесу часцей здзяйсняюць не жыхары бліжніх вёсак, а юрыдычныя асобы. Так, неяк затрымалі прадстаўніка фірмы, які высякаў дрэвы і потым пастаўляў матэрыял за мяжу.

Інспектары шчыльна супрацоўнічаюць з калегамі па ахове правапарадку — следчымі, міліцыяй. За мінулы год у Мінскай вобласці ў браканьераў канфіскавалі 57 адзінак незарэгістраванай зброі.

...Бліжэй да вечара вяртаемся ў Мінск. Мы з фотографам — па дамах, а інспектары — зноў у палі. Іх рэйд скончыцца толькі а шостай вечара наступнага дня. Так што прырода заўсёды пад пільным наглядам.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Творчы падыход

НА РАБОТУ, ЯК НА СВЯТА

Хто адказвае за канцэрты ў глыбінцы?

Адны выпускнікі ўніверсітэтаў успрымаюць размеркаванне ў раён як трагедыю. Іншыя — як шанц заявіць пра сябе. 26-гадовы Уладзімір БАБІЧАЎ — з апошніх. Ужо тры гады хлопец узначальвае раённы Цэнтр народнай творчасці, культуры і вольнага часу ў Дуброўне. Пад крылом маладога дырэктара — дом рамёстваў, гарадскі ДК і сельскія клубы.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

На сцэне Уладзімір з сямі гадоў. Спяваў, іграў у спектаклях, танцаваў. Скончыў музычную школу па класе баяна і фартэпіяна. Займаў прызавыя месцы на розных конкурсах і фестывалях самадзейнасці. Таму ў шостым класе вырашыў, што будучая прафесія павінна быць звязана з творчасцю.

Бацькі хлопца працуюць у сельскай гаспадарцы. Тата механізатар, мама — загадчыца малочнатаварнай фермы. Марылі, каб сын стаў інжынерам. Уладзімір нават паспрабаваў паступіць на праграміста, але не хапіла аднаго бала. «Відаць, лёс», — падумаў хлопец і пайшоў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, куды з лёгкасцю здаў экзамены.

Сам Уладзімір з вёскі Сваташыцы Дубровенскага раёна. Калі паступаў у ВНУ, браў мэтавае накіраванне, таму на адпрацоўку вярнуўся ў райцэнтр. І з энтузіязмам узяўся за справу. Спачатку быў метадыстам у адной з устаноў культуры, а праз год узначаліў раённы Цэнтр народнай творчасці, культуры і вольнага часу.

— Для мяне важная дысцыпліна. Той, хто яе парушае, не зможа тут доўга затрымацца, — дзеліцца Уладзімір. — Некаторыя супрацоўнікі ў два разы старэйшыя за мяне, але я змог стаць для іх аўтарытэтам. Так, я амбіцыйны, але не лічу, што гэта дрэнна.

Малады дырэктар каардынуе ўстановы культуры ў раёне: дапамагае ім арганізоўваць канцэрты, спартландыі, дыскатэкі, прадумвае бізнес-план. Вырашае праблемы з апаратурай — у парадку жывой чаргі набывае ў сельскія клубы калонкі, мікшарныя пульты, мікрафоны. Штогод Уладзімір арганізуе міжнародны фестываль песні і музыкі «Дняпроўскія галасы», куды з'язджаюцца калектывы самадзейнасці з Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, Славакіі. Каб завабіць жыхароў на мерапрыемствы, актыўна анансуе іх у сацыяльных сетках і вядзе ютуб-канал «Дубровеншчына культурная».

— Ідэі для канцэртаў і свят прыдумваю сам, — кажа хлопец. — Ніколі не карыстаюся інтэрнэтам, калі пішу сцэнарый. Нядаўна, напрыклад, мы праводзілі конкурс «Суперцешча». Удзельніцам трэба было скласці оду зяцю, прыгатаваць яго любімую страву.

На гэты год планаў у дырэктара шмат. З новых задум — правесці свята варэння, свята бабульчынай хусткі. Шмат мерапрыемстваў рыхтуе да 625-годдзя Дуброўна, якое мясцовыя жыхары будуць святкаваць улетку.

І хоць у хлопца шмат адміністрацыйных абавязкаў, прызнаецца, што не можа жыць без самадзейнасці. Уладзімір вядзе ледзь не ўсе канцэрты і фестывалі ў раёне, спявае, іграе ў тэатральных пастаноўках. Цікаўлюся, якая роля яму больш блізкая.

— Мне падабаецца іграць прыгажуноў. У апошнім спектаклі «Марозка» я быў Іванам. Сябе люблю, пакрасавацца таксама люблю, — усміхаецца. — Я іграю станоўчых персанажаў: у мяне такі тыпаж. А вось самая нелюбімая роля, скажу пад сакрэтам, — Дзеда Мароза. Хоць яна ў мяне добра атрымліваецца (у 2012 годзе, калі вучыўся ва ўніверсітэце, на адным з конкурсаў стаў найлепшым навагоднім чараўніком Мінска), псіхалагічна гэта складана. Бо не ўсе дзіцячыя жаданні — напрыклад, зрабіць так, каб былі жывыя бацькі, — магчыма выканаць.

Паколькі выступаць даводзіцца часта, сцэнічны гардэроб ва Уладзіміра — велізарны: шэсць касцюмаў, дваццаць кашуль, шэсць пар чаравікаў, па дзесяць гальштукаў і бабачак... «Артыст заўсёды павінен выглядаць добра», — тлумачыць хлопец.

Разам з творчымі калектывамі Уладзімір ездзіць на гастролі не толькі ў суседнія раёны, але і за мяжу. Напрыклад, у Дагдзе (латвійскім горадзе — пабраціме Дуброўна) бывае кожны год.

Пытаюся ў маладога дырэктара, як ён адпачывае, калі канцэрты і спектаклі — гэта яго работа. «Праводжу выхадныя з сябрамі, — расказвае хлопец. — Калі цёпла, выязджаем на прыроду. Люблю бываць у бацькоў у вёсцы. За вячэрай можам спяваць разам. Але ад работы я таксама атрымліваю асалоду».

Уладзімір — зайздросны жаніх. Кожны дзень яго сватаюць. Дубровенец з усмешкай прызнаецца: такая ўвага яго збалавала. Але на сёння хлопец выбірае кар'еру. Хоча займаць высокі пост і добра зарабляць, каб будучая сям'я была забяспечана. «Задум вельмі шмат. Не хаваю, магчыма, у будучыні пераеду ў сталіцу ці абласны цэнтр. Але пакуль я ў Дуброўне, хачу зрабіць для гэтага горада максімум магчымага».

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Мінск—Дуброўна—Мінск.

«З ДЗЯЦІНСТВА ВЕДАЛА: БУДУ АКТРЫСАЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Маім вялікім сябрам быў і дзядуля, Валянцін Сяргеевіч Белахвосцік, таксама ў свой час акцёр Купалаўскага тэатра. Мне яго часта не стае. У дзядулі і бабулі дзве дачкі: старэйшая — мая мама Зоя Белахвосцік, актрыса Купалаўскага тэатра, і малодшая, мая цётка, Надзея Белахвосцік, яна журналіст. Сям'я вельмі творчая, хоць і не ўсе акцёры. Звычайна чалавек здольны ўлюбіцца ў тое, што бачыць вакол, калі гэта прыносіць яму нейкае задавальненне, таму я з дзяцінства ведала, што буду актрысай.

— Купалаўскі тэатр вашага дзяцінства, які ён?

— Мяне часта бралі з сабой бацькі, якія ледзь не кожны дзень ігралі ў спектаклях. Тады ўсё тут было крыху па-іншаму. У старых тэатрах заўсёды накопліваюцца нейкія прадметы, рэчы: частка рэквізіту, старая мэбля, канапы. Я іх добра памятаю. Усе вакол — акцёры, рэквізітары, касцюмеры — імкнуліся мяне чымсьці заняць, нешта паказвалі. Было шмат акцёрскіх дзяцей майго ўзросту ў той час, і ў нас была выдатная кампанія. Канешне, я тады не ўспрымала тэатр у нейкім высокім сэнсе. Я глядзела спектаклі, нават дарослыя, але ўсё роўна бацькі заставаліся для мяне мамай і татам.

— Яны заўсёды пакідалі права выбару за вамі?

— Так. Яны мне толькі раілі штосьці. Натуральна, гэта была іх ідэя, каб я паступала ў тэатральную школу. Для гэтага летам трэба было здаваць іспыты: песню, танец, рускую і беларускую літаратуру — урывак, байку, верш... Зразумела, у трынаццаць гадоў на канікулах мне хацелася гуляць, а не нешта вучыць. Тады, памятаю, бацькі сур'ёзна размаўлялі са мной: Валя, калі ты хочаш стаць актрысай, павінна папрацаваць над сабой, прымусіць сябе. Я вельмі ўдзячная ім за гэта.

«У кіно мяне выкарыстоўваюць па-іншаму. Там сыграла шмат адмоўных персанажаў».

Сістэма выкладання ў школе вельмі падобная на тую, што была ў нашай тэатральнай акадэміі: спачатку ўрокі, а пасля тэатральнае майстэрства. Нягледзячы на тое, што я тэатральнае дзіця, вельмі саромелася і не магла займацца з бацькамі, таму школа мне моцна дапамагла. Шчыра прызнацца, бацькі мяне ўвогуле не рыхтавалі да паступлення ў тэатральную акадэмію. Нашмат пазней мне стала лёгка працаваць з бацькам як з рэжысёрам (Аляксандр Гарцуеў — мастацкі кіраўнік Тэатра беларускай драматургіі. — **Аўт.**) і адрозніваць, дзе сям'я, а дзе прафесія.

— Прыходзілася сутыкацца з прадузятымі адносінамі, калі вас успрымалі як дачку акцёраў?

— Ад гэтага ціску я пазбавілася літаральна нядаўна. Гэта не значыць, што ён быў, — я сама развіла ў сабе такі комплекс. Мне здаецца, сярод студэнтаў у акадэміі хадзілі нейкія размовы, маўляў, ну, зразумела, у яе ж тата і мама. А ў тэатры ўсё больш сур'ёзна, там ніколі з такім не сутыкалася. Мне самой ніколі не хацелася засмучаць бацькоў, было настолькі страшна зрабіць што-небудзь не так, калі б усе сказалі, што прырода на мне адпачыла. Не хацелася, каб з-за мяне ўсе дрэнна думалі пра маіх бацькоў-дзядуляў-прадзядуляў. Таму я сябе ўвесь час мучыла: ты павінна працаваць больш і лепш. Не проста мне было справіцца з такой адказнасцю. І зусім нядаўна зразумела, што я ў прафесіі толькі таму, што хачу працаваць і мне гэта падабаецца. І я нікому нічога не павінна.

— Бацькі за вашымі спектаклямі сачылі з самага пачатку?

— Канешне. Першы раз я працавала з бацькам на чацвёртым курсе тэатральнай акадэміі, калі ў нас пачаліся пастаноўкі дыпломных спектакляў. Адзін з іх паставіў мой тата. Спектакль называецца «Хам», па той жа п'есе, што ідзе зараз у Купалаўскім тэатры. Безумоўна, гэта два розныя спектаклі. Але тая работа, якую ён правёў са мной у акадэміі, аказалася вельмі грунтоўнай базай для цяперашняй ролі. Яе можна параўнаць з чатырма гадамі навучання. Для маладога акцёра гэта вялікая карысць і падарунак — адразу сутыкнуцца з такім глыбокім і складаным персанажам. У гэтым сэнсе мне сапраўды пашчасціла: я ніколі не сядзела і не чакала роляў. У мяне добрая занятасць і сапраўды шмат роляў.

У спектаклі «Чайка».

— Адчувалі, што вам ад бацькі-рэжысёра дастаецца больш за астатніх?

— Гэта было цалкам відавочна. Ён жа верыў у мяне і ведаў, што я магу ўсё рабіць лепш. А вера для акцёра вельмі важная, праўда, гэта я цяпер разумею. А тады перажывала, што ён цісне на мяне больш, чым на іншых, вельмі з-за гэтага расстройвалася. Такое вось дзіцячае было ўспрыманне. Зараз падчас рэпетыцыі я магу ціснуць на сябе сама, для гэтага мне ўжо хапае вопыту і разумення. А тады быў нават не ціск, ён проста працаваў са мной, вучыў. Таму для мяне ён не толькі бацька і рэжысёр, а яшчэ і выдатны педагог.

— У каго з бацькоў навучыліся большаму?

— За мамай я больш назірала. Мне заўсёды было цікава, што яна робіць як актрыса. Мама мяне натхняла, а бацька даваў практычныя парады.

— У тэатры ў вас у асноўным станоўчыя, калі не сказаць, гераічныя ролі...

— У пастаноўках адмоўных персанажаў увогуле няшмат. Вось у «Хаме» ёсць складаны характар, з неадназначнымі рысамі. Франка вельмі няпросты персанаж, актрысе трэба добра разумець, што з ёй адбываецца, і ўсё роўна гэта не залог поспеху. А так у маім рэпертуары пераважна гераічныя і драматычныя дзяўчаты. Яны ўсе розныя: Ніна Зарэчная ў «Чайцы», Ганна ў «Людзях на балоце», Паліна ў «Нямым». Але ўсе светлыя. Вось у кіно мяне выкарыстоўваюць паіншаму. Там сыграла шмат адмоўных персанажаў. Ад каранёў валасоў да кончыкаў пальцаў — абсалютнае зло.

— Складана іх сыграць?

— Мне заўсёды няпроста. Над усім я шмат думаю, аналізую. У кіно, асабліва ў серыялах, патрэбныя такія полюсы — чорнае і белае. Там заўсёды ёсць жанчына, якая саспсуе жыццё галоўнай гераіні. І на маю долю выпала шмат такіх роляў. Але калі ў героя за яго дрэннымі ўчынкамі ўнутры ёсць уласная праўда, ён разумее, чаму гэта робіць, тады ён не здаецца такім жахлівым. Ты ж не можаш іграць зло. Ты павінен шукаць, дзе твая праўда, чаму ты — зло. Калі ў тэатры ў гэтым плане ёсць дзе разгарнуцца, то ў фільме ў цябе ўсяго пяць сцэн. І нават калі ты прыдумала сабе перадгісторыю, вельмі невялікая верагоднасць, што паспееш яе ўвасобіць. Звычайна я не вельмі задаволеная сабой у фільмах. Адна з тых карцін, дзе я сабе больш-менш падабаюся, — «Участак лейтэнанта Качуры». Я там іграю следчага, які дапамагае ўчастковаму разблытваць складаныя і страшныя справы: пра наркотыкі, падлеткаў. Мяне захапіла работа, дынамічны сцэнарый, я сачыла за гісторыяй, і было цікава іграць.

«Мне самой ніколі не хацелася засмучаць бацькоў, было настолькі страшна зрабіць што-небудзь не так, калі б усе сказалі, што прырода на мне адпачыла».

— Якую работу нядаўна скончылі ў кіно?

— Я вось думала, чаму я ніколі не здымалася ў такога выдатнага рэжысёра, як Аляксандр Яфрэмаў, вельмі хацелася з ім папрацаваць. І так атрымалася, што трапіла ў яго фільм «Фламінга», які пакуль яшчэ не выйшаў на экраны, але работу мы амаль скончылі. На днях паглядзела свае сцэны, і мне спадабалася. Фільм вельмі добры, з прыгожым фіналам. Мне радасна бачыць маіх калег, беларускіх акцёраў, у добрых ролях. Іх праца мяне натхніла.

— Ці складана ўвогуле знаходзіцца ў творчым калектыве, дзе кожны — таленавітая асоба?

— У нашым тэатры вельмі добрыя акцёры, і мне ў гэтым плане пашчасціла. З усімі лёгка, хоць усе працуюць па-рознаму. Ніхто ніколі не падманвае, не робіць выгляд, што працуе. І гэта вельмі важна, калі творчыя людзі робяць сваю справу ў поўную сілу. Тут заўсёды было так заведзена, і напэўна, у гэтым і крыецца поспех Купалаўскага тэатра.

«І зусім нядаўна зразумела, што я ў прафесіі толькі таму, што хачу працаваць і мне гэта падабаецца. І я нікому нічога не павінна».

— Паўлінка — амаль ваш сямейны спектакль...

— Так, у ім іграў мой прадзядуля, мама. Я іграла, праўда, не доўга — гады тры. Вельмі хвалявалася заўсёды. Спектакляў ва ўсе часы было шмат. Калі я іграла, было яшчэ дзве актрысы акрамя мяне на ролю Паўлінкі. А мая мама іграла адна. Я цікавілася, як гэта ў яе атрымлівалася. Там велізарная нагрузка, вельмі важна, каб актрыса аддавала шмат энергіі.

— Што адказвала мама?

— Такая прафесія. Асабіста ў мяне «апетыт» прыходзіць «падчас яды». Вось ведаю, што праз дваццаць хвілін будзе спектакль, а ў мяне няма энергіі, сіл, каб выйсці на сцэну. Але пачынаецца пастаноўка, я выходжу — і сілы з'яўляюцца.

— Зала натхняе?

— Яна вельмі розная бывае. Сёння гучная, адразу рэагуе, а заўтра на тым жа спектаклі — поўная цішыня. Гэта не значыць, што гледачам не падабаецца, яны проста па-іншаму ўспрымаюць. Я не знайшла гэтаму тлумачэнне: як так здараецца, што 350 чалавек рэагуюць, як адзіны арганізм. Уключыць, завесці залу — гэта наша задача. Глядач нам нічога не павінен... Увогуле ў акцёрстве нельга стамляцца ад прафесіі. Калі такое адчуванне з'яўляецца, гэта вельмі дрэнная прыкмета.

— З вамі такое здараецца?

— Канешне, бываюць розныя моманты. Бывала, што ненавідзела сябе ці проста была незадаволеная. І заўтра такое зноў можа здарыцца. Праўда, я ніколі не апускаю рукі, не думаю, што трэба сыходзіць з прафесіі. Я вельмі давяраю сваім бацькам, ведаю, што яны мяне любяць. І калі б мае бацькі ці чалавек, якога я кахаю, сказалі б мне: ты ведаеш, ты вельмі дрэнная актрыса, я б сышла з прафесіі. Веру, што дзеля маёй карысці яны не сталі б маўчаць.

— Дарэчы, ваш каханы чалавек — нямецкі акцёр Жан-Марк Біркхольц — не збіраецца звезці вас да сябе на радзіму?

— Мы хочам жыць там, дзе будзем сапраўды шчаслівыя. Жан-Марку падабаецца ў Беларусі. А я вельмі люблю Купалаўскі тэатр.

Алена КРАВЕЦ.

У ролі Ганны ў спектаклі «Людзі на балоце».

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
1 02 2018 г.

Не летнікам адзіным

ЗДАЦЬ НА «РАЗРАД»,

або Па законах скаўтаў

У студзені 1988 года некалькі энтузіястаў, якія прачыталі ў адной з газет нататку пра малавядомы ў нас на той момант рух скаўтаў, сабралі ў сталічным парку імя Горкага невялікую групу дзяцей. Вынікам сустрэчы стала стварэнне першага беларускага скаўцкага патруля «Арлы», у складзе якога было дзевяць чалавек. А ўжо ў канцы года ў Мінску з'явілася і першая дружына пад назвай «Форт-Няміга». Чым сёння жыве арганізацыя, як стаць яе членам і што такое здача «на пяро», «Чырвонцы. Чырвонай змене» расказала камісар па навучанні і трэнінгу Беларускай рэспубліканскай скаўцкай асацыяцыі (БРСА) Марыя ЖУК.

Абавязковая ранішняя працэдура ў летніку — пастраенне.

Калі рух зацягвае

— Сама я далучылася да руху ў 1997 годзе ва ўзросце 11 гадоў, — усміхаецца Марыя. — Вучылася ў школе, і да нас прыйшоў адзін з лідараў арганізацыі, які расказаў пра тое, чым у іх займаюцца хлопцы і дзяўчаты. Як толькі я пачула словы «вогнішчы, палаткі, паходы», то зразумела, што гэта маё. Кожнае лета ў дзяцінстве праводзіла ў вёсцы ці на лецішчы, мне гэта падабалася, таму ідэя захапіла. Праўда, на першых занятках трохі здзівілася — мы нікуды не пайшлі, а замест гэтага пачалі разбірацца з асновамі скаўтынга: вучылі гісторыю арганізацыі, яе законы, замалёўвалі вузлы, вывучалі віды вогнішчаў, удзельнічалі ў развівальных гульнях. Так прайшоў цэлы год, і толькі потым, калі кожны меў тоўсты спісаны сшытак з тэорыяй, мы ўпершыню адправіліся ў летнік.

Скаўцкая арганізацыя сёння — гэта больш за 1,1 тысячы ўдзельнікаў па ўсёй краіне: як дарослых, так і дзяцей.

У 11 класе Марыя стварыла ўласны патруль — на працягу года ён актыўна дзейнічаў: хадзіў у паходы, на выстаўкі, ездзіў на экскурсіі. «Скаўцкі рух — гэта не толькі летнікі, ён накіраваны на развіццё ўсёй асобы: ведаў, уменняў, інтэлектуальных і духоўных каштоўнасцяў», — сцвярджае дзяўчына. Але пасля паступлення ў інстытут студэнцкае жыццё настолькі зацягнула Марыю, што ад скаўцтва прыйшлося адмовіцца. Вярнулася выпадкова — на 20-годдзе арганізацыі былую актывістку запрасілі прыняць удзел ва ўрачыстых мерапрыемствах, і пасля візіту яна зразумела, што не можа без гэтага жыць. У другі раз дзяўчына прыйшла на «дарослую» пасаду — пачала ўдзельнічаць у навучанні моладзі, праводзіла семінары і трэнінгі для лідараў.

— Цяпер я распрацоўваю комплексную сістэму работы з дарослымі, — кажа камісар. — У Сусветнай скаўцкай арганізацыі ёсць свае патрабаванні да гэтага, і мы імкнёмся ім адпавядаць. Гэта не так проста, бо скаўтынг — валанцёрская дзейнасць, грошай за яе не атрымліваюць, праграма скіравана на развіццё асобаснага росту. Звычайна дарослыя працуюць у трох кірунках: непасрэдна работа з дзецьмі (кіраўніцтва атрадамі і дружынамі), з іншымі дарослымі (арганізацыйная падтрымка, трэнінгі) і работа ў структуры арганізацыі (у якасці сакратароў, бухгалтараў і гэтак далей).

Нямногія ведаюць, што Віфлеемскі агонь у Беларусь прывозяць менавіта скаўты.

Ад квэстаў да балю

— Мы робім шмат спраў апроч арганізацыі летнікаў, пра якія многія ведаюць, — сцвярджае Марыя. — Цэнтральнае месца ў нашым руху займаюць абяцанні і законы, вакол іх усё і будуецца. Але і прырода — вельмі важны элемент, мы хочам, каб моладзь вучылася жыць у гармоніі з ёй. Тым больш гэта актуальна для сучасных хлопчыкаў і дзяўчатак, якія часам у дзесяцігадовым узросце бачылі жывёл толькі на малюнках. Але выезды ў лес — далёка не адзіны элемент нашай работы. На працягу года мы збіраемся на базе школ, цэнтраў дзіцячай творчасці і прыдумляем новыя праекты. Гэта могуць быць і гарадскія квэсты, і сацыяльныя акцыі (напрыклад, кожную вясну мы ўдзельнічаем у Тыдні лесу, які арганізуе Міністэрства лясной гаспадаркі, — пад Стоўбцамі за гэтыя гады вырас цэлы «скаўцкі» лес у некалькі гектараў), і перадача Віфлеемскага агню, які па краінах свету развозяць скаўты. А яшчэ ёсць скаўцкі баль — вельмі прыгожае мерапрыемства, якое мы праводзім напярэдадні Новага года. Арандуем залу ў Палацы дзяцей і моладзі, а хлопцы і дзяўчаты самі, без удзелу прафесіяналаў, праводзяць рэпетыцыі, падбіраюць танцы (як класічныя, так і сучасныя), ну а потым — выступаюць.

Скаўцкая арганізацыя сёння — гэта больш за 1,1 тысячы ўдзельнікаў па ўсёй краіне: як дарослых, так і дзяцей. Самыя вялікія падраздзяленні дзейнічаюць у Мінскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцях. Асобна можна вылучыць добра вядомую сярод беларускіх скаўтаў Смаргонскую дружыну, якая нядаўна адзначыла сваё дваццацігоддзе. На ўсходзе краіны дзейнічаюць пераважна невялікія групы. Далучыцца да арганізацыі проста, калі ў населеным пункце ўжо існуе атрад. Трэба звязацца з сакратаром або галоўным скаўтам і прыйсці на заняткі. Ад дзіцяці патрабуецца толькі жаданне і заява аб уступленні ў арганізацыю, а таксама ўступны ўнёсак у памеры 15 рублёў (далей штогод трэба плаціць па 10 рублёў). Калі да месца дыслакацыі найбліжэйшай дружыны далёка, адзіны варыянт — стварыць уласную. Але гэта не так проста — трэба мець хоць бы двух ці трох дарослых, якія пагодзяцца ахвяраваць часткай свайго вольнага часу. Марына прызнаецца, што ў арганізацыі застаюцца не ўсе, — калі размова заходзіць пра скаўцкія законы і традыцыі, нехта разумее, што гэта не яго.

Добрае вогнішча арганізуе толькі сапраўдны майстар!

«Іх задача — увесь час маўчаць, пераначаваць і вярнуцца ў лагер. Есці можна толькі тое, што знойдуць у лесе, напрыклад ягады».

Навошта «ваўчанятам» пёры?

— Лагер — цэнтральнае мерапрыемства летняй кампаніі, — расказвае Марыя. — Мы арганізуем іх ужо шмат гадоў, таму ніякіх асаблівых складанасцяў не ўзнікае. Цяпер прыходзім да таго, каб гэта мерапрыемства праходзіла ў выглядзе Джамбары — сусветнага скаўцкага злёту, які штогод праводзіцца ў розных краінах свету. Ёсць падобныя мерапрыемствы на рэгіянальным узроўні (напрыклад, у нашым, Еўразійскім, удзельнічаюць дзевяць краін). Беларускі скаўцкі лагер — гэта фактычна нацыянальны Джамбары — на яго прыязджаюць дзеці з усіх куткоў краіны. Удзел у мерапрыемстве бяруць 200—250 чалавек.

Вялікую частку часу ў лагеры займаюць штодзённыя справы: гатаванне ежы, нарыхтоўка дроў, дзяжурства. Але паралельна таксама праходзяць заняткі. Дзеці і падлеткі працягваюць вывучаць тэорыю і асвойваць скаўцкія спецыяльнасці. Прычым гендарная прыналежнасць амаль не мае значэння: ёсць як дзяўчаты, што выдатна асвоілі піянерынг (тэхніку стварэння разнастайных будынкаў з вяровак і жэрдак), так і хлопцы, якія добра кухараць. Акрамя гэтага, вялікую частку часу займаюць гульні: «Астравы», «Свісток», «Кім». Нярэдка вячэрнія пасядзелкі каля вогнішча змяняюцца «Жураўлямі і кропкамі», калі кожны атрад рыхтуе сваё выступленне, у якім расказвае пра падзеі дня (гэта можа быць перароблена песня, гумарыстычны нумар ці танец), а кожнае выступленне замест апладысментаў вітаецца гучнымі крычалкамі.

«Цэнтральнае месца ў нашым руху займаюць абяцанні і законы, вакол іх усё і будуецца. Але і прырода — вельмі важны элемент, мы хочам, каб моладзь вучылася жыць у гармоніі з ёй».

Скаўцкай маскіроўцы падчас гульняў пазайздросцілі б і сапраўдныя індзейцы!

— Ёсць яшчэ «здача на разрад», — расказвае Марыя. — Для кожнага ўзросту ў нас прапісаны мэты развіцця, яны пазначаны ў рабочых сшытках, якія выдаюць скаўтам. Так, для «ваўчанят» і «ваверчанят» (хлопчыкаў і дзяўчатак 6—10 гадоў) гэта і практычныя ўменні, напрыклад раскладанне пэўных відаў вогнішчаў, і агульначалавечыя — скажам, «не засмучацца пры паразе». Дарослыя назіраюць за тым, як дзеці ўсё гэта выконваюць, а пасля група абмяркоўвае, ці сапраўды ўдзельнік дасягнуў сваёй мэты. Калі ўсе згодны, — у сшытку ставіцца паметка, а калі ўсе паметкі сабраны, скаўту прысвойваецца новае званне і ўручаецца спецыяльны знак.

Нельга не сказаць і пра выпрабаванні. Многія скаўты адгукаюцца на запрашэнні праверыць свае здольнасці ў розных кірунках. Адзін з такіх конкурсаў — «бумеранг». Яго сутнасць у тым, што дарослы разам з дзіцем, вочы якога завязаны, адыходзіць на пэўную адлегласць ад лагера. Падлетку трэба сарыентавацца на мясцовасці, зразумець, дзе ён знаходзіцца, і вярнуцца ў каманду. Дарослы пры гэтым, вядома, толькі назірае, але не дапамагае.

Ці яшчэ адзін прыклад — «пёры». «Адно пяро» — гэта простая «маўчанка», якую здаюць малодшыя, — трэба некалькі гадзін нічога не гаварыць. Для старэйшых (ад 12 гадоў) заданне больш складанае: скаўты бяруць мінімальны набор патрэбных рэчаў (запалкі, ваду, нож, вяроўку і спальнік або турыстычны дыванок на выбар) і групай ідуць у лес на адну ноч. Іх задача — увесь час маўчаць, пераначаваць і вярнуцца ў лагер. Есці можна толькі тое, што знойдуць у лесе, напрыклад ягады. За гэтым выпрабаваннем таксама сочаць дарослыя. Паводле слоў Марыі, самае складанае ў «здачы на пяро» — не прагаварыцца, большасць «гарыць» якраз на гэтым.

Выдатная магчымасць адплаціць прыродзе, якая летам становіцца другім домам, — удзел у Тыдні лесу.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

Друкуецца ў «Маладосці»

Вучаніца мінскай гімназіі № 1 імя Францыска Скарыны ўжо не ўпершыню друкуецца ў «Маладосці». Гэтым разам да паэтычных старонак далучылася эсэ, якое падштурхнула рэдакцыю заклікаць астатніх маладых аўтараў таксама раскрываць таямніцы сваёй творчасці. Адказы на пытанне «Як вы пішаце/ствараеце/ натхняецеся/думаеце?» у форме эсэ прымаюцца ў часопіс у рамках праекта «Адваротны бок старонкі», прысвечанага блізкаму 65-годдзю «Маладосці». Вось так занатаваныя думкі школьніцы нараджаюць ідэі для ўсёй краіны. Далучайцеся!

Яна НІКІФАРАВА

ПАЎНАТЫ ШУКАЙ

Урывак з эсэ

Саджуся за пісьмовы стол. Перада мной нататнік з чыстымі лістамі. Прыгажосць, папера ледзь не адбівае сонечныя промні! Асадка — новая, аловак — вастрэйшы за жарты Джорджа Карліна. Здаецца, усё спрыяе нараджэнню геніяльных (ну, хоць бы вартых увагі) радкоў. Але ніводнае слова ў галаву не ідзе. Літаральна ніводнае. Хіба што лаянкавае. Што ж такое? Злосна загортваю нататнік.

Ці так. Зарадка батарэі тэлефона — сто працэнтаў, тэкставая праграма — спампаваная, яркасць дысплея — максімум і беларуская раскладка клавіятуры... Зноў той самы вынік: ніводнага радка, ніводнай рыфмы. Нават дзеяслоўнай.

Ведаю я гэта Натхненне. Яно такое легкадумнае. Прыйдзе, відаць, у самы нязручны момант. Калі буду падразаць на лецішчы галіны бэзу. Ці несціся з хуткасцю променя, каб паспець забраць заказ з багетнай студыі. Ці, найбольш магчыма, у той час, калі ў захапленні буду перагортваць старонкі Рэмарка. Калі ні тэлефона пад рукой, ні нататніка...

Міжволі задумваюся, якія ўмовы для Натхнення самыя прыдатныя? Калі жаданне пісаць апраўдваецца і ператвараецца ў вершы, якія самой не сорамна перачытваць? Памятаю, чытала нейкую Бум-Бам-Літаўскую п'есу, і адзін з яе персанажаў прамовіў наступнае: «Сапраўдная (чытай — вартая) паэзія — пакуты. Нясцерпная горыч». Ці штосьці падобнае, сутнасць дакладна такая. Я тады актыўна паківала галавой, бясслоўна пагадзілася і запомніла гэтыя словы. Ну а што? Сапраўды, уся паэзія, якая чапляе асабіста мяне наймацней, не ззяе вясёлкавай яскравасцю. Я прыхільніца дэкадэнцтва, вочы загараюцца пры чытанні Бадлера. У такіх радках адчуваю нерв жыцця, яго пульсаванне, хай сабе і нейкае трывожнае, перадсмяротнае.

Так, вечна юная, вы будзеце ў магіле!
Вам, неўміручая любоў,
Пасля таемстваў быць развалінай у цвілі
І парахнець між чарапоў!

Вось і мае вершы набываюць цёмнае адценне. Танцоры самазабіваюцца, надрэзаўшы нітку дыска-шара, унутраная прызма змяняе аранжавы колер на шэры, жар пачуццяў абпальвае ўнутраны сад... Бабулі з дзядулямі незадаволена і з сумневам падціскаюць вусны, хлопец сумна ўздыхае. А што зрабіць, калі менавіта ў самоце і разгубленасці прыходзіць падтрымаць Паэзія? У маім выпадку не шапоча пяшчотна што-небудзь накшталт: «Ну, давай, падыміся, усміхніся, усё будзе добра, сонейка ўзыдзе!», а рэзка падхоплівае, крычыць з усяе моцы: «Пад'ём! Бяжы адсюль, уяві сабе самыя непрыемныя і змрочныя вобразы, уключы надрыўны Joy Division і стварай, стварай! Толькі так ты здолееш, як Мюнхгаўзен, схапіць сябе за валасы і выцягнуць з багны!» І, паверце, я слухаюся. Слухаюся, выхопліваю з кішэні тэлефон (але спачатку насоўку, каб выцерці слёзы) і націскаю, націскаю на дысплей, набіраючы і выдаляючы каштоўныя літары. І ўсё ўжо не здаецца такім безнадзейным...

Тое, што ўва мне

«Я НЕ БАЧУ СЯБЕ БЕЗ МУЗЫКІ...»

Ці бывае голас глыбокі, як вір? Безумоўна! І гэта — не прыгожыя словы, паверце. Менавіта такім валодае маладая спявачка з Камянеччыны Жанна ВЯРЭНІЧ...
Яе голас «задуманы», літаральна створаны нейкай вышэйшай сілай, што размяркоўвае таленты паміж людзьмі, менавіта — і выключна! — для народнай песні. Той самай, каштоўнасць якой ніхто не аспрэчыць. Пра музыку, нашу спадчыну, паўсядзённае жыццё творчага чалавека і не толькі паразважаем разам з Жаннай. І пачнём, вядома ж, з вытокаў...

Фота Мікалы ШУМА.

* * *

Малая радзіма дзяўчыны — прыгожая вёска Макарава, што ў Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці. Тут яна скончыла пачатковую школу, якой цяпер ужо няма, потым працягвала вучобу ў сярэдняй у Высокім. Любімым прадметам былі — што б вы думалі? — спевы, а яшчэ — родная беларуская мова. Жанна ўдзельнічала ва ўсіх школьных ранішніках і канцэртах, а ў дзясятым класе ўпершыню выйшла на сцэну Макараўскага сельскага Дома культуры. Была таксама і музычная школа па класе акардэона, бо дзяўчыне заўсёды было даспадобы гучанне гэтага інструмента. Жанна таксама спявала ў хоры, але тады яшчэ ў акадэмічнай манеры. Да народнай прыйшла пазней. «Зразумела, што яна сапраўды МАЯ», — тлумачыць дзяўчына.

Калі прыйшоў час вызначыцца з прафесіяй, рабіць выбар было лёгка. Жанна вырашыла не спрачацца са сваім неадольным жаданнем спяваць і з аптымістычнаю думкаю-спадзяваннем «А раптам атрымаецца? А раптам заўважаць?» паступіла ў Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў на спецыяльнасць «Народная творчасць. Харавая музыка» (арганізатар культурнай дзейнасці і вольнага часу, кіраўнік хору). Шкадаваць не давялося. Столькі цікавага было: і заняткі, і канцэрты, і народны хор навучэнцаў «Верас»...

Эстрадныя спевы Жанну не прывабілівалі. «Напэўна, таму, што да іх цягнула ўсіх», — тлумачыць яна. Правільнасць выбару пацвердзілася потым падчас праслухоўвання. Студэнты выходзілі па чарзе і спявалі «Купалінку» акапэла. Жанна Вярэніч слухала іншых (у большасці ўладальнікаў сапрана) і вырашыла: выйду ды заспяваю ніжэй. У выніку яе голас аднеслі да альтовых, якому найбольш пасуе народная манера выканання.

Пасля каледжа Жанна трапіла па размеркаванні ў сельскі цэнтр рамёстваў і культуры аграгарадка Каменюкі, дзе два гады працавала мастацкім кіраўніком. Самым запамінальным з праведзеных мерапрыемстваў стала святкаванне Новага года, якому ў месцы, размешчаным побач з Нацыянальным паркам «Белавежская пушча» і сядзібай беларускага Дзеда Мароза, надаецца асаблівае значэнне. Мерапрыемства па матывах «Вечароў на хутары ля Дзіканькі» сабрала поўную залу...

Акрамя таго, у сельскім цэнтры Жанна Вярэніч вяла яшчэ і заняткі гуртка мастацкай самадзейнасці для дарослых і дзяцей. Прычым адна з яе вучаніц нават паступіла ў той жа каледж у Гродне.

Два гады размеркавання праляцелі хутка... Новым месцам работы Жанны стаў шматнацыянальны інтэрнат Брэсцкага дзяржаўнага політэхнічнага ўніверсітэта. З трохсот насельнікаў сотня — іншаземцы з Пакістана, Непала, Бангладэш, Кітая, Туркменістана, Індыі, Бутана і Нігерыі.

Для новай працы спатрэбіліся веды ў галіне педагогікі. Таму Жанна завочна скончыла педуніверсітэт імя Максіма Танка ў Мінску. Сёння ў абавязкі дзяўчыны ўваходзяць арганізацыя культурных мерапрыемстваў для студэнтаў і дапамога ў наладжванні ўзаемаадносін.

У інтэрнацыянальным асяроддзі Жанне працуецца цікава: «Спасцігаю культуру розных народаў і не стамляюся здзіўляцца». Дзяўчына ўдзельнічала, напрыклад, у святкаванні кітайскага Новага года, а таксама Курбан-байрама, напярэдадні якога студэнты-туркмены набылі недзе барана, а потым гатавалі плоў, якім частавалі ўсіх, — такая традыцыя.

* * *

Сёння ў рэпертуары Жанны Вярэніч як спявачкі — беларускія, рускія і ўкраінскія песні. Ёй бясконца імпануе фальклор, бо ён — аснова, крыніца, гісторыя, традыцыі. «У народнай песні, у адрозненне ад іншых (не ўсіх, натуральна), ЗАЎСЁДЫ ёсць сэнс», — гаворыць дзяўчына.

Кожны новы твор спявачка абавязкова падстройвае пад сябе. Увогуле, заўсёды стараецца спяваць па-свойму, прапусціць праз душу і сэрца, пражыць песню. Калі ж гаварыць пра выступленні, то, падбіраючы да іх рэпертуар, Жанна ўлічвае і месца будучага канцэрта, і тэматыку яго, і слухача, і нават час сутак: спяваць днём у парку і вечарам там жа адно і тое ж — немагчыма.

На пытанне аб выканаўцу, які ўразіў найбольш і ў якога хочацца вучыцца, Жанна адказвае адназначна і без роздумаў: «Пелагея!» І дадае: «Калі б мая запаветная мара здзейснілася, я трапіла б на праект «Голас» і да мяне павярнуліся б усе суддзі, выбрала б у настаўнікі толькі яе».

З беларускіх калектываў народнай накіраванасці Жанна аддае перавагу «Бяседзе». А калі казаць пра наш бясцэнны фальклор і яго захаванне, дзяўчына выдзяляе праект тэлеканала «Беларусь 3» «Наперад у мінулае». З яго можна пачарпнуць столькі цікавага: і спеваку, і аматару народнага ў цэлым. Часам удаецца прыкмеціць нейкую песню і ўзяць яе «мінусоўку».

Жанна Вярэніч ахвотна выступае — заўсёды ўжывую! — на самых розных сцэнах: у Каменцы і Высокім, на розных пляцоўках Брэста. Прычым абласны цэнтр у свой час падарыў ёй магчымасць удзельнічаць у канцэрце брэсцкага ансамбля танца «Радасць» на сцэне Брэсцкага абласнога акадэмічнага тэатра драмы імя Ленінскага камсамола Беларусі.

Перад выхадам на сцэну заўсёды просіць Божае падтрымкі і настройваецца на народную песню, якая «прадугледжвае стрыманасць і акуратнасць у абыходжанні».

«Спяваць не так лёгка, як можа здавацца, — дадае Жанна. — Самы дарагі, шыкоўны музычны інструмент без рук музыкі не народзіць ні гуку. Так і голас не існуе без спевака і яго працы».

Цікаўлюся, ці ўдзельнічае Жанна Вярэніч у якіх-небудзь конкурсах ды фестывалях. Адказам мне становіцца сумнае: «Не так часта. Павінна адзначыць, што ў нашай краіне, на жаль, для выканаўцаў народнай песні іх не так і шмат». Сярод самых значных дасягненняў спявачкі — удзел у фестывалях нацыянальных культур у Гродне і «Ружанскай браме», рэспубліканскім конкурсе ў складзе каманды Гродзенскай вобласці, а таксама дыплом трэцяй ступені рэспубліканскага конкурсу «Зорка ўзышла над Беларуссю».

«Увогуле кастынгі не люблю, — даверліва расказвае Жанна. — Да таго ж часта бачу, як людзі з выдатнымі галасамі выбываюць з іх «з-за адсутнасці харызмы». Гэта дзіўна...»

Але аднойчы спявачка ўсё ж рашылася на адну авантуру... У 2015-м таемна ад усіх паехала ў Брэст на кастынг, які арганізоўваў пераможца «Еўрабачання» Аляксандр Рыбак. Ён напісаў песню для гэтага конкурсу і шукаў для яе выканаўцу, прычым менавіта з народным голасам.

Жанна выканала тады дзве песні. Аляксандр зрэагаваў вельмі станоўча, пахваліў. Дзяўчыне аб'явілі, што першы тур яна прайшла, і абяцалі патэлефанаваць. З другім, на жаль, не склалася, але спявачка не шкадуе, што паспрабавала свае сілы...

На апошняе маё пытанне — «Што для цябе музыка?» — Жанна Вярэніч адказала: «Не люблю гучных слоў, таму няхай будзе так: без яе я сябе не бачу».

Настасся НАРЭЙКА.

Увага, конкурс!

ФОРМУЛА ПОСПЕХУ,

ці Вядомыя і пачаткоўцы пад адной вокладкай

Зборнік апавяданняў пра Мінск вядомых аўтараў і тых, хто толькі пачынае пісаць, выйдзе па выніках літаратурнага конкурсу. Работы на яго прымаюцца да 1 сакавіка.

Мэта гэтага адмысловага спаборніцтва — заахвочванне і падтрымка літаратурнай творчасці маладых людзей, папулярызацыя чытання, нацыянальнай мовы і культуры. Ідэя «10 + 10» належыць арганізатарам фестывалю «Горад і кнігі», які сёлета пройдзе 18—19 мая ў Мінску трэці раз. «Горад і кнігі» — праект, арганізаваны валанцёрамі. За ўвесь час у яго рамках адбылося больш за 300 кніжных і літаратурных мерапрыемстваў, якія наведалі звыш 16 тысяч чалавек. Конкурс «10 + 10» праводзіцца сумесна з часопісам «Маладосць». Пасля яго заканчэння ў адным выданні будуць сабраныя кароткія творы пра беларускую сталіцу 10 вядомых аўтараў і 10 аўтараў-пачаткоўцаў.

На конкурс прымаюцца творы прозы на беларускай мове, якія раней нідзе не былі апублікаваныя. Удзельнікам можа стаць любы грамадзянін краіны ва ўзросце 18—30 гадоў. Найлепшыя работы будуць выбраныя прафесійным журы, у склад якога ўвойдуць арганізатары конкурсу. Больш падрабязна з яго ўмовамі можна азнаёміцца на сайце фестывалю «Горад і кнігі». Частку тыражу зборніка плануецца перадаць у бібліятэкі краіны. Апавяданні пераможцаў таксама будуць надрукаваныя ў часопісе «Маладосць». Творы прафесійных аўтараў апублікуюць на старонках выданняў — партнёраў праекта — да выхаду зборніка, прэзентацыя якога адбудзецца на фестывалі «Горад і кнігі».

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
1 02 2018 г.

SEX=БАЛЯСЫ

УКАЛВАЮЦЬ РОБАТЫ...

...Памятаеце фільм «72 метры» пра падводнікаў? Там ёсць такі эпізод, калі марак — герой Улада Галкіна — даведваецца, што на час паходу на іх субмарыну часова прыкамандзіраваны навуковец-медык. Пачуўшы пра апошнюю акалічнасць, афіцэр кажа таму: «Значыць, гэта па вашай частцы. Тут такая справа... Да нас з Нарвегіі па ленд-лізе паступіла партыя латэксных дзяўчат. Толькі нікому, партыя абмежаваная... Вы павінны схадзіць на склад і ўзяць гэтых латэксных дзяўчат». Навуковец здзіўлена перапытвае: «Для чаго?» «Не для чаго, а для каго, — папраўляе падводнік. — Для камандзіра і старпама. Мы ў паходзе неяк абыходзімся, а вось яны...» Наступны эпізод, калі прыкамандзіраваны дакладвае камандзіру падлодкі ў выкананні акцёра Андрэя Краско: «Загваздачка выйшла... На складзе зараз няма дзяўчат...» І тут капітан першага рангу па мянушцы Янычар як зараве пра «козыраў дзіўных», якім ён зараз... Што камандзір абяцаў экіпажу? Прыкладна тое, для чаго і патрэбны латэксныя дзяўчаты...

Прыгадайце, як смяяліся з гэтага эпізоду? Здагадаліся, да чаго хілю? Ніхто ж раней сур'ёзна ўсё гэта не ўспрымаў, пра гумавых жанчын большасць з нас доўгі час гаварыла выключна ў форме анекдотаў. Хоць некалькі пазней я прачытаў, што ў камплектацыю амерыканскага танка «Абрамс» можа ўваходзіць гумавая ванна — для камфорту экіпажа... Неяк нават пацікавіўся ў чалавека, які прайшоў Афган: ці праўда? Той спакойна паціснуў плячыма і адказаў, маўляў, усё можа быць, не здзіўлюся, калі ў іх апроч ванны і лялька з таго ж матэрыялу ў камплекце маецца. Пажартаваў, вядома... Для нас жа лялькі раней — гэта Бураціна і кампанія або чароўнае стварэнне доктара Гаспара з «Трох таўстуноў»... Але, як той казаў, КВЗ ужо не той. Ці, як у свой час спяваў гурт «Іванушкі», «лялька Маша, лялька Міша, лялька Саша і Арыша, проста гады дзіцячыя прайшлі...» Вось ужо што сапраўды прайшло, дык прайшло. Як казаў Астап Бэндэр у «12 крэслах»: «Мы з вамі чужыя на гэтым свяце жыцця...»

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Але як па мне, дык і не патрэбна нам такое «свята». («Пасля скасавання шлюбу прадаўшчыца сексшопа пачала паціху красці з крамы».) Калі раней слухаў «Скалалазку» Высоцкага, ніякіх пошлых думак і блізка не ўзнікала. «Страхавала ты мяне з асалодаю, альпіністка мая гутаперчывая...» Цяпер апошняе слова прымушае хутчэй напружыцца, калі чытаеш навіны з замежжа. Там секс-лялькі ўжо — учарашні дзень. Як там далей у «Іванушак»? «Лялька Маша, лялька Даша, проста дзеці пасталелі, проста-проста ўсе мы падраслі!..» У фаворы за мяжой зараз — сапраўдныя секс-робаты, якія вельмі рэалістычна нагадваюць чалавека... Не, можна, канешне, было пажартаваць кшталту «жанчына, якая маўчыць, лічыцца прыгожай па замоўчанні». («80 працэнтаў мужчын імітуюць смачны боршч».) Але ўдумайцеся...

Што ні гавары, а «правільная жанчына — тая, якую нельга надзьмуць».

Як паказалі даследаванні, прысвечаныя галоўным тэхналагічным трэндам, 25 працэнтаў апытаных маладых людзей ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў гатовы да рамантычных адносін з робатамі ў найбліжэйшай будучыні. Ці не празорцам на гэтым фоне можна назваць Мікалая Растаргуева з яго колішнім «ты агрэгат, Дуся, ты, Дуся, агрэгат, ты агрэгат, Дуся, на сто кілават»? Пакуль іншыя б'юць трывогу, асцерагаючыся хуткага пранікнення ў наша жыццё робатаў, пакаленне міленіялаў змірылася з такой непазбежнасцю і адкрыта заяўляе аб гатоўнасці ўступіць у адносіны з андроідамі. Міленіялы — пакаленне Y, людзі, народжаныя з 1980 па 2000 год. Ім уласцівы амбіцыйнасць, мэтанакіраванасць, а таксама цяга да ўсяго новага. («Часцей за ўсё словы «трэба паспрабаваць у жыцці ўсё» азначаюць алкаголь і секс. Радзей квантавую фізіку і малекулярную хімію».)

Не сакрэт, што ўжо цяпер гаджэты могуць сачыць за намі. Ніхто не думаў, што секс-лялька ў адзін момант па чыёйсьці камандзе зможа ператварыцца ў баявога робата? І да шыі (ці чаго там яшчэ) партнёра яму будзе літаральна руку выцягнуць... («Была абсалютна ўпэўнена, што заняла месца ў яго сэрцы. Аказалася, сяджу ў пячонцы і выношу мозг».) Чыталі, што першага ў свеце робата-прадаўца «звольнілі» з працы праз тыдзень у тым ліку і за недарэчныя жарты? («Няма такой ідэальнай жанчыны, якая нічога не патрабавала б ад мужчыны. Нават гумавую падпампоўваць трэба».)

І вось пра галоўнае. Уласна, пра жанчын... Пры такім раскладзе, выходзіць, яны стануць непатрэбнымі? Нам ніколі і ў галаву не магло прыйсці пры праглядзе «Прыгод Электроніка», «да чаго дойдзе прагрэс, да якіх нябачаных цудаў». Вось сапраўды «ўкалваюць робаты, а не чалавек»! І вы ведаеце, са з'яўленнем суперсучасных секс-лялек у свеце ўжо пачалі пра гэта задумвацца, у тым ліку і прыгожы пол. Калі дагэтуль папулярным было феміністычнае «мы створаны не для таго, каб гатаваць ежу, мыць і гадаваць вашых дзяцей», дык зараз загучала «толькі мы можам гатаваць ежу, мыць і гадаваць вашых дзяцей». Наконт апошняга — дакладна. Таму нам, мужчынам, застаецца толькі падтрымаць гэтыя словы. («— Вы арыштаваныя! Вы маеце права захоўваць маўчанне. Усё, што вы скажаце, можа быць выкарыстана супраць вас! — Голая жанчына! — Што голая жанчына? — Выкарыстайце супраць мяне голую жанчыну!») Што ні гавары, а «правільная жанчына — тая, якую нельга надзьмуць».

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

ІНТЫМНЫ ПРАБЕЛ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Можа, у гэтым вінаватыя самі мамы і таты, якія забараняюць падлеткам узнімаць сексуальныя тэмы?

— Так, да гэтага часу менталітэт забароны ў Беларусі вельмі моцны, і гэта шкодзіць дзецям не толькі ў кантэксце сексуальных сувязяў. Ёсць і іншыя бакі сталення, па якіх бацькі зусім не адукоўваюць падлеткаў: напрыклад, фізіялогія абодвух полаў. На апошнім занятку на пытанне «З кім бацькі наогул не размаўлялі пра палавое сталенне?» ледзьве не траціна групы падняла рукі. Між тым, «дзецям» па 15—16 гадоў, — дзеліцца валеолаг. — А да нас ад школы яны могуць прыйсці толькі падчас класных гадзін разам з настаўнікамі. І да 14 гадоў мы нават права не маем з імі гаварыць пра сексуальныя моманты без бацькоў. Таму на бацькоўскіх сходах гутарым з дарослымі. А яны нам — «Ой, вы лепш самі ўсё дзецям раскажыце, без нас!». Але не ўсё так дрэнна: нехта, наадварот, слухае і потым прыходзіць разам з дзіцем, калі не гатовы самастойна размаўляць пра гэтыя рэчы. Мы дапамагаем пачаць размову на роўных.

Як наогул павінна выглядаць палавое выхаванне? Пра гэта вядуцца бясконцыя спрэчкі. Пакуль статыстыка на баку Еўропы: у краінах, дзе з дзецьмі адкрыта гавораць на інтымныя тэмы, значна ніжэйшая колькасць падлеткавых цяжарнасцяў, абортаў і венерычных захворванняў — старшакласнікі банальна не саромеюцца купляць прэзервацівы і ведаюць, як імі карыстацца. Больш за тое, канадскія даследчыкі правоў непаўналетніх сцвярджаюць: дзеці, якім рана растлумачылі, што такое сексуальная згода і асабістая прастора, радзей становяцца ахвярамі педафілаў, таму што дарослым не ўдаецца імі маніпуляваць.

Па словах Інэсы Палазнік, у Беларусі пакуль не хапае рэсурсаў на палавое выхаванне ні па навуковым, ні па духоўным вектары: урачоў-педагогаў, якія маглі б весці такія ўрокі ў кожнай школе, няма, а святары працуюць з падлеткамі толькі ў валанцёрскім фармаце.



— У нас ужо ўвялі ў рамках дапрызыўнай падрыхтоўкі заняткі па бяспечным ладзе жыцця, прафілактыцы венерычных захворванняў, але гэта зноў-такі 10—11 класы, калі старшакласнікі ўжо ўсё паспрабавалі. Па законе ўзрост сексуальнай згоды — 16 гадоў, але гаварыць пра сексуальнае выхаванне трэба ўжо з 14. Пра фізіялогію — яшчэ раней, у 10—11 гадоў, — упэўненая Інэса Палазнік. — А ў школьнай праграме толькі анатомія чалавека ўпершыню з'яўляецца толькі ў 9 класе. Гэтага, вядома, недастаткова.

Гаварыць пра сексуальнае выхаванне трэба ўжо з 14. Пра фізіялогію — яшчэ раней, у 10—11 гадоў.

Пастаянна ў кантэксце сталення ўсплываюць і праблемы гендара: пытанні правілаў зносін паміж мужчынам і жанчынай непазбежныя. І тут праблема відавочная: сярод наведвальнікаў індывідуальных кансультацый — толькі два працэнты юнакоў. Валеолаг кажа, што ў цэнтры нават няма стаўкі андролага (спецыяліста па мужчынскім рэпрадуктыўным здароўі): настолькі нізка запатрабаваныя такія кансультацыі. Хлопцам расказваць пра псіхалагічныя і фізіялагічныя складанасці «не належыць», ідэальны вобраз моцнага мужчыны такіх слабасцяў не дапускае: з усімі праблемамі ты павінен умець разбірацца самастойна, таму ў сексуальных пытаннях даводзіцца абапірацца зноў жа на сеціва, словы аднагодкаў і надзею, што «прырода падкажа». У выніку клопат не толькі пра кантрацэпцыю, але і проста пра здаровыя стасункі ў пары аказваецца цалкам на плячах дзяўчатак, якія ў сваю чаргу пастаянна паддаюцца псіхалагічнаму ціску партнёраў з-за страху быць абсмеянымі. Кансультацыі ў цэнтрах, дзе ўрачы і падлеткі гавораць на роўных без сораму і забароненых тэм, павінны патроху выпраўляць гэтую сітуацыю.

— Мы не кажам «нельга ўступаць у палавыя адносіны», — тлумачыць валеолаг. — Мы кажам «нельга, калі ты не гатовы». Вучым, як правільна сказаць «не». Як не пакрыўдзіць партнёра, але пры гэтым і не зняважыць сябе. Мы тлумачым, што такое сексуальная культура, заклікаем берагчы сябе для аднаго партнёра, не распыляцца на некалькіх, берагчы не толькі фізічныя, але і духоўныя складнікі адносін.

Зараз у Мінску ў кожным раёне ёсць па адным «Цэнтры, дружалюбным падлеткам». Здавалася б, прасцей за ўсё мець падлеткавага ўрача пры кожнай школе, але валеолаг з гэтым не згодная: па яе словах, без поўнай ананімнасці кансультацыя працаваць не будзе, бо ў школе ўсе адзін аднаго ведаюць. Будзе страх, што твая гісторыя, а стане вядомая іншым. А вось у цэнтры, дзе ўсё канфідэнцыяльна, прыходзяць добраахвотна. Тут можна нават прайсці тэст на ВІЧ — бясплатна і ананімна. І, дарэчы, даступна гэта не толькі падлеткам: праверыцца можа кожны ва ўзросце да 24 гадоў. Робіцца тэст літаральна за 20 хвілін. На праверку бярэцца не кроў, а сліна з рота, а сам аднаразовы інструмент вельмі падобны на тэст на цяжарнасць: адна палоска — здаровы, дзве — заражаны. Такім жа чынам можна запісацца ў цэнтр і на агляд гінеколага, і на тэст на захворванні, якія перадаюцца палавым шляхам, і на ўльтрагукавое абследаванне.

Адрасы і тэлефоны ўсіх «Цэнтраў, дружалюбных падлеткам», ёсць на сайце junior.by. Дапамога канфідэнцыяльная і бясплатная.

Кацярына ЖОРАВА.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 31.01.2018 г.

РАТУЮЧЫ ПРЫРОДУ, ДАПАМАГАЕМ ДУШЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Выстаўка — гэта вынік работы, якая доўжылася амаль паўтара года. Гэта — 11 стэндаў, якія паступальна расказваюць пра тое, чаму адной з частак жыцця кожнага чалавека павінна стаць уважлівае стаўленне да прыроды. Інфармацыйныя стэнды падрыхтаваны на дзвюх мовах: па-беларуску і па-руску.

«Гэтая выстаўка — элементарны інструмент для святароў і выкладчыкаў агульнаадукацыйных і нядзельных школ, для кіраўнікоў маладзёжных брацтваў і ўсіх ахвотных казаць пра ашчаднае стаўленне да тварэння, — тлумачыць куратар праекта Сяргей Юшкевіч, які ўзначальвае кірунак «Царква і навакольнае асяроддзе» Цэнтра экалагічных рашэнняў. — Выстаўка аўтаномная, яе можна як вывучыць самастойна, так і праводзіць па ёй экскурсію».

Плануецца, што выстаўка будзе размяшчацца ў каталіцкіх парафіях і праваслаўных прыходах. Але, па вялікім рахунку, яна можа быць карысная для любой арганізацыі. Адзін з самых яркіх, і, мабыць, ключавых стэндаў прысвечаны таму, якім чынам царкоўная супольнасць або любая іншая можа стаць экалагічна дружалюбнай. Напрыклад, можна зрабіць насценгазету на тэму беражлівых адносін да прыроды, зладзіць кіналекторый, асобна збіраць смецце, не прыносіць штучныя кветкі на могілкі і не выкарыстоўваць пластыкавыя

Сяргей ЮШКЕВІЧ праводзіць экскурсію па выстаўцы.

налепкі для ўпрыгожвання велікодных яек.

«Сучасны свет сутыкаецца з многімі крызісамі. Адным з самых небяспечных з іх з'яўляецца экалагічны, — лічыць архіепіскап Тадэвуш Кандрусевіч, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі. — Касцёл заўсёды клапоціцца аб захаванні прыроды, ведаючы пра тое, што Бог стварыў гэты свет, і тады ўсё было добра. Ён благаславіў чалавека і даў яму ўладу над гэтым светам. Даў уладу, але не даў ва ўласнасць гэты свет. Калі мы даём пакарыстацца камусьці камп'ютарам ці кнігай, то спадзяёмся, што іх вернуць у тым жа стане, што мы аддавалі, а не разаб'юць ці запэцкаюць. На жаль, сучасны чалавек так робіць з прыродай: карыстаецца прыроднымі рэсурсамі, каб разбагацець, і не думае, што будзе далей. Заразтаксама ёсць небяспека, што навакольнае асяроддзе можа не аднавіцца. А гэта ж наш клопат і адказнасць».

Па словах айца Іаана Ляшчанкі, члена рабочай групы Беларускай праваслаўнай царквы па рэалізацыі Праграмы супрацоўніцтва паміж БПЦ і Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у дні царкоўных свят мы выкарыстоўваем шмат неэкалагічных атрыбутаў, пластыку. Напрыклад, на Вербную нядзелю галінкі для асвячэння ўпрыгожваюць пластыкавымі кветкамі. «Ёсць Радаўніца, калі могілкі з месца цішыні і малітвы ператвараюцца ў нейкі кітч, дзе занадта яркія па колеры пластыкавыя кветкі не даюць магчымасці задумацца пра вечнасць і блізкіх. Адмовіцца ад пластыку ў прыходзе можа кожны! — упэўнены святар. — Калі вельмі хочацца, то вербачкі можна ўпрыгожыць папяровымі кветкамі, а на могілкі прынесці жывыя. Таксама лепш адмовіцца ад набыцця ў паломніцтвах святыняў у выглядзе маленькіх папяровых абразоў, бо надалей невядома, што з гэтым рабіць. Можна ж неяк па-іншаму захаваць успамін пра святыя мясціны, пакінуць памяць аб малітве, ахвяраваць на манастыр. Мы заклікаем адзін аднаго да ўмеранасці, да ўмення харчавацца хлебам надзённым. Кожны з нас можа гаварыць пра гэта на сваім месцы, у сваім прыходзе».

На працягу двух гадоў выстаўка «Чалавек і стварэнне» будзе экспанавацца ў розных епархіях Беларусі. Таксама яе можна самастойна замовіць у свой прыход, школу або любую іншую ўстанову бясплатна. Кірунак «Царква і ахова навакольнага асяроддзя» заклікае ўсіх ахвотных прымаць пасільны ўдзел у развіцці царкоўна-экалагічнага руху ў Беларусі. «Калі вы хочаце арганізаваць царкоўна-экалагічнае мерапрыемства ў прыходзе, але не ведаеце, з чаго пачаць, мы будзем рады дапамагчы вам», — заклікаюць арганізатары на адным са стэндаў. Калі ў вас з'явілася такое жаданне, вы можаце звязацца з імі па электроннай пошце e-mail: ecotvorenie@gmail.com або тэлефоне 375-29-252-71-45. Калі яшчэ маеце сумневы, то можаце паглядзець выстаўку ў электронным варыянце на сайце http://tvorenie.by/ у раздзеле «Ініцыятывы».

Вераніка ПУСТАВІТ.

Духавенства таксама зацікавілася падзеяй.

■ Крокі да Шагала

ПАМЯЦІ АХВЯР ХАЛАКОСТУ

У віцебскім Музеі Марка Шагала можна ўбачыць графіку Меера Аксельрода. Яго пры жыцці, як і Шагала, крытыкавалі, доўгі час мастак не быў зразумелы сучаснікамі. Супрацоўнічаў з рэжысёрам Сяргеем Эйзенштэйнам, сябраваў з паэтам і перакладчыкам Арсеніем Таркоўскім, іншымі вядомымі творчымі асобамі.

Фота Аляксея СПАТКАЯ.

Ізраільскі мастацтвазнаўца, калекцыянер Ілья Васільеў адзначае, што раней выстаўка «Нямецкая акупацыя ў графіцы Меера Аксельрода» не экспанавалася, беларусы яе ўбачаць першымі ў свеце. Аўтар, дарэчы, нарадзіўся ў Маладзечне — у 1902 годзе. Ізраільска-беларускі праект — пачатак «вяртання імя» Аксельрода на яго Радзіму.

Як трапна заўважыла **дырэктар шагалаўскага музея Ірына Воранава**, у гэтым пытанні яе маладзечанскія калегі паўтараць шлях віцебскіх. Трэба многае зрабіць, каб у Маладзечне, як і ў родным горадзе Шагала, з'явілася тое, што нагадвае пра знакамітасць. Каб туды таксама прыязджалі аматары творчасці. А для гэтага неабходны экспанаты, арганізацыя музея.

Графіка, якая экспануецца ў Віцебску, мае свае асаблівасці. Яна выканана ў тым ліку і на абрыўках, бланках, газетах. Пісаў мастак і з двух бакоў. Гэта — з-за дэфіцыту паперы падчас эвакуацыі. Мы бачым яго вачыма папялішчы, руіны, няшчасных людзей, у якіх адна перспектыва — смерць. Хоць мастак не жыў на акупаваных тэрыторыях, але ж праз сэрца прапускаў усе жахі, боль тых, каго забівалі, гвалтавалі, з каго здзекаваліся ў гета. І яшчэ падчас Вялікай Айчыннай, калі невядома было, чым яна скончыцца, пачаў рабіць замалёўкі...

...У Аксельрода было нялёгкае жыццё. Яго творчы шлях да вядомасці вельмі складаны. У прыватнасці, у 1930-я разам з мноствам вядомых мастакоў трапіў пад прэс крытыкі, яго абвінавачвалі ў фармалізме. Пры гэтым у 1934 годзе яго карціны выстаўляліся ў Францыі. Што толькі не друкавалі пра мастака савецкія газеты! Напрыклад, ён атрымаў «па поўнай» за: песімізм, дэфармацыю, нясканчанасць, экспрэсіянізм. Крытыкавалі і за блізкасць творчых падыходаў да Мадыльяні.

У выніку наш зямляк быў вымушаны заняцца ілюстрацыяй кніг і работай у тэатры. Зрабіў творчы ўклад і ў кінематограф. Асабіста Сяргей Эйзенштэйн запрасіў яго ў Алма-Ату для стварэння дэкарацый да фільма «Іван Грозны».

Як напісаў пра мастака Арсеній Таркоўскі: «Гэта выдатны прыклад таго, як выгадна быць сумленным і чыстым чалавекам... Вы бачыце зусім наглядна, які выдатны плён гэта прыносіць, як дорага тое, што робіцца людзьмі такога роду, якія з сапраўды святой упартасцю, з жалезнай воляй прабіваюцца скрозь усе перашкоды».

Творчае прызнанне мастак атрымаў, як гэта часта здараецца, пасля смерці (памёр у 1970-м). Персанальныя выстаўкі адбываліся ў 1970—1980-х — у Маскве, Ленінградзе. А ў 1990—2000 гадах зноў у Маскве, Нью-Ёрку, Лондане, Германіі, Ізраілі....

Творы Меера Аксельрода захоўваюцца ў Трацякоўскай галерэі, Рускім музеі, музеі выяўленчых мастацтваў імя А. С. Пушкіна. Як адзначылі на прэзентацыі выстаўкі, ёсць яны і ў нашым Нацыянальным мастацкім музеі.

Выстаўку прэзентавалі напярэдадні Міжнароднага дня памяці ахвяр халакосту. Пасля Віцебска яе запланавана прадставіць у музеях Расіі, Германіі, Ізраіля, іншых краін.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ Сталіца

Карэта Папялушкі, копія Эйфелевай вежы і заплыў дэльфінаў

У Мінску адкрыўся «Парк чароўных ліхтароў»

Шоу светлавых інсталяцый зроблена па прыкладзе кітайскага аналага. Дарэчы, і сам праект рэалізаваны пра падтрымцы партнёраў з акругі Юаньчжоў. Парк раскінуўся па тэрыторыі «Дрымлэнда», пабываць там можна пасля 16.30 і да 23.30 штодня.

Плануецца, што ў такім фармаце выстава будзе працаваць да мая, пасля чаго не закрыецца, а, наадварот, падоўжыць час наведвання да дзвюх гадзін ночы. Да таго ж, у цёплую пару года на тэрыторыі парку з'явяцца пункты з вулічнай ежай. Усяго ж наведвальнікі змогуць убачыць 40 кампазіцый, сярод якіх светлавы калідор, карэта Папялушкі, Эйфелева вежа, закаханая пара, розныя жывёлы: дэльфіны, жырафы, мядзведзі і многае іншае. Дарэчы, у сярэдзіне студзеня стала вядома, што сам парк забаў «Дрымлэнд» выстаўлены на таргі. У 2016 годзе кампанію, якой ён належыць, прызналі эканамічна неплацежаздольнай. Стартавы кошт продажу парку — 29,1 млн руб. Да гэтага яго ўжо выстаўлялі на таргі, але ахвотных яго набыць не знайшлося.

Дар'я КАСКО

ЧАС ШЫШАК

У лясгасах Беларусі вядзецца нарыхтоўка шышак елкі і сасны. У гэтым сезоне (з восені мінулага года да сёлетняй вясны) плануецца нарыхтаваць 521,5 тоны шышак і атрымаць больш за 6000 кілаграмаў насення, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі.

Традыцыйна асноўную долю ад агульнага аб'ёму складзе насенне сасны звычайнай — 4900 кілаграмаў. Акрамя таго, будзе нарыхтавана 1100 кілаграмаў насення елкі еўрапейскай і 10 кілаграмаў насення лістоўніцы еўрапейскай.

У міністэрстве адзначылі, што ў лясгасах Беларусі шышкі збіраюць на спецыяльных плантацыях, дзе растуць сосны, елкі, піхты з палепшанымі якасцямі. На дадзены момант ужо нарыхтавана больш за 263 тоны шышак, каля 81 тоны паступіла на перапрацоўку ў лесанасенныя цэхі. Частка сыравіны ўжо перапрацаваная, астатні ўраджай пакуль знаходзіцца на захоўванні.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАО «СМУ-77» извещает своих акционеров о том, что отдельными акционерами в период **с 29 по 30 января 2018 года** поданы предложения о продаже принадлежащих им акций Общества в количестве до 3000 (три тысячи) штук по цене 18 (восемнадцать) рублей за 1 (одну) акцию. Тел./факс 017-344-23-21

УНН 100064641

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»29 марта 2018 года проводит 5-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номера лотов	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
48	Грузовой КамАЗ-4310 ш. 028544 дв. 043796 1987 г. 4 кат. 84 343 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	8 000,00	800,00
49	Грузовой КамАЗ-4310 ш. 017636 дв. 878927 1986 г. 4 кат. 83 881 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	8 000,00	800,00
50	Грузовой КамАЗ-43105 ш. М0007555 дв. 0811070 1991 г. 4 кат. 72 310 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	8 000,00	800,00
51	Грузовой Урал-4320 ш. 004904 дв. 259021 1981 г. 4 кат. 83 995 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	7 000,00	700,00
52	Грузовой Урал-4320-0011 ш. 012145 дв. б.н. 1982 г. 4 кат. 54 186 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	8 000,00	800,00
53	Автошасси ГАЗ-66-04 ш. 0229483 дв. 2208807 1980 г. 4 кат. 6 398,9 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	2 400,00	240,00
54	Автошасси ГАЗ-66-11 ш. 0510744 дв. 185286 1987 г. 4 кат. 2 966 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	2 500,00	250,00
55	Автошасси Урал-375А ш. 243826 дв. 414844 1977 г. 4 кат. 4 149 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	5 000,00	500,00
56	Автошасси Урал-375А ш. 351019 дв. 390962 1981 г. 4 кат. 1 675 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	5 000,00	500,00
57	Автошасси Урал-375АМ ш. 405310 дв. 952496 1983 г. 4 кат. 3 389 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	5 000,00	500,00
58	Автошасси Урал-375АМ ш. 407106 дв. 8947 1983 г. 4 кат. 2 836 км КР-1994 г.	г. Старые Дороги, в/ч 48668	5 500,00	550,00
59	Автошасси Урал-375Е ш. 148677 дв. 520956 1973 г. 4 кат. 2 543 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	5 000,00	500,00
60	Автошасси Урал-375Е ш. 148669 дв. 520957 1973 г. 4 кат. 2 428 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	5 000,00	500,00
61	Грузовой Урал-432000-01 ш. 135317 дв. 520311 1989 г. 4 кат. 59 729 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	7 000,00	700,00
62	Грузовой ГАЗ-66-05 ш. 0200570 дв. 2028398 1980 г. 4 кат. 4 115 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	2 800,00	280,00
63	Грузовой ГАЗ-66-15 ш. 0491776 дв. 61463-87 1987 г. 4 кат. 1 072 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	3 000,00	300,00
64	Грузовой Урал-4320-0610 ш. 020717 дв. 148820 1983 г. 4 кат. 51 105 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	7 500,00	750,00
65	Автошасси МАЗ-5334 ш. 67604 дв. 695640 1984 г. 4 кат. 1 810 км. Кузов-фургон км-500 № 5473 1984 г. 4 кат.	г. Старые Дороги, в/ч 48668	6 000,00	600,00
66	Автошасси МАЗ-5334 ш. 28431 дв. 563980 1981 г. 4 кат. 1 595 км. Кузов-фургон км-500 № 57 1981 г. 4 кат.	г. Старые Дороги, в/ч 48668	6 000,00	600,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **29 марта 2018 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **16.00 26 марта 2018 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **29 марта 2018 г. с 9.00 до 9.45.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY31BLBB30120101099370001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код BLBBBY2X, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 (RUR), в Центре банковских услуг № 701, ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код BPSBBY2X, УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090 Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**.

Справки по тел./факс: (017) 398 05 41.

ОАО «Крупский плодоовощной завод» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона

Лот № 1

Капитальное строение с инвентарным № 613/С-10556, расположенное по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г. Крупки-2, площадь – 1 598,1 м², назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание хранилища техники

Земельный участок площадью 5,6931 га с кадастровым номером 623050100001002292. Целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания хранилища техники. Право аренды – по 01.10.2102 г. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

В отношении вышеуказанного имущества проводятся вторые повторные торги. Публикация об аукционе ранее размещалась 12.01.2018 г. в газете «Звязда». Цена на предмет торгов снижена на 20 %. Окончание приема заявлений в 16.00 26.02.2018 г.

Начальная цена Лота с НДС 20 %	101 760,00 белорусских рублей
Задаток	10 176,00 белорусских рублей
Шаг аукциона	5 % от начальной стоимости предмета торгов
Организатор торгов	ООО «Фрондера», тел. +375 29 305-86-50
Информация о продавце	ОАО «Крупский плодоовощной завод», Минская область, г. Крупки, ул. Московская, д. 1 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122)
Дата и время проведения торгов	**28 февраля 2018 года в 12.00 (регистрация с 11.40 до 11.55)** по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 11, конференц-комната № 609
Заявление на участие в торгах и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122	
